Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МККП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 24 (5698) | 30 студзеня 1937 г., субота | ЦАНА 10 КАП.

Всесоюзная библиотека

Всесоюзная библиотека имени В. И. Ленина

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

Ваенная калегія Вярхоўнага суда Саюза ССР вынесла прыгавор па справе антысовецкага трацкісцкага цэнтра.

Воля народу выканана. Банда трацкісцкіх дыверсантаў, шпіёнаў і тэрарыстаў раздаўлена.

Працоўныя БССР аднадушна вітаюць прыгавор Вярхоўнага суда.

ГАДЗІНА РАЗДАЎЛЕНА

Сёння мы публікуем прыгавор Ваеннай калегіі Вярхоўнага суда па справе антысовецкага трацкісцкага паралельнага цэнтра. Воля народу ажыццёўлена. Трацкісцкая шматталовая гадзіна забойцаў, шпіёнаў, шкоднікаў радзімы раздаўлена.

Меч пролетарскай дыктатуры апусціўся на шыю шматталовага звера, пускаўшага са свайго агіднага джала смуродны, смярдзючы яд.

Трацкізм — перадавы атрад фашызма і вайны. Ална з яго арганізацый, узняўшая сваю крывавую руку на магутны народ, пала, паказаўшы ўсю глыбіню маральнага разлажэння людзей, падняўшых зброю ворагаў — шпіянаж, шкодніцтва дыверсію, тэрор, каб раздавіць краіну сацыялізма.

Скончыўшыйся працэс многаму вучыць. Ён выявіў, што ідэі подлай зграі трацкістаў не маюць глебы ў СССР, што яны нарадзіліся і створаны ў капцылярыях замежных контрразведак.

Народным масам СССР глыбока гідлівы мэты і метады трацкісцкай банды азвярэлых галаварэзаў. І гэта сказалася не толькі ў тым факце, што рабочыя і сяляне ў разалюцыях сваіх сходаў закляймілі ганьбаю згніўшых і маральна апусціўшыхся да апошняй мяжы членаў трацкісцкай арганізацыі, але і ў тым факце, што гэта зграя забойц нават баялася зварочвацца да рабочых і калгаснікаў ветаючы, напэўна, што атрымае ад іх самы рашучы адпор.

Гэты факт — яркае сведчанне адданасці народу СССР ідэям сацыялізма, адзінству народу, які змагаецца за поўнае таржаство ідэй сваіх вялікіх правадыроў і настаўнікаў Маркса, Энгельса, Леніна, Сталіна. Працэс выявіў, што людзі, адпойчы ўзняўшыя руку на Совецкі Саюз, немінуча скатваюцца ў смуродную яму контррэволюцыі, немінуча аказваюцца цацкай у руках фашызма, выконваючы па яго даручэнню самую подлую работу катаў.

Працэс выявіў, што контррэволюцыя ў барацьбе з Совецкім Саюзам карыстаецца цяпер самай вострай, самай подлай зброяй, паказваючы ў якую вострую фазу класавай барацьбы ўступіў свет.

Вайна, якую рыхтуе фашызм супроць Совецкага Саюза, не ёсць звычайны метад імперыялізма для вырашэння сваіх унутраных эканамічных супярэчнасцей. Падрыхтоўка вайны супроць СССР ёсць арганізаная вайна, ёсць адна з галоўных на данай стадыі развіцця форм барацьбы буржуазіі супроць сацыялізма. Гэта відаць не толькі на прыкладзе СССР, але і на прыкладзе рэволюцыйнай Іспаніі. І ў Іспаніі, і ў СССР гэта стала відавочным. На даным этапе галоўным перадавым атрадам падрыхтоўкі вайны з'яўляецца самы агацелы вораг рабочых і сялян — трацкізм. Працэс над антысовецкім трацкісцкім цэнтрам выкрыў гэту подлую ролю трацкістаў—душыцеляў і вешацеляў рабочага класа. Але не толькі паслугамі трацкістаў карыстаецца імперыялізм. Правыя, таксама як і трацкісты, з'яўляюцца сканцэнтраваннем усіх контррэволюцыйных сіл. Гэта паказаў ужо ход працэс. Фашысцкая разведка, кінуўшы ў СССР перадавы атрад падрыхтоўкі вайны — трацкістаў, шпіёнствуючы і шкодзячы, правакуючы сутычкі з замежнымі дзяржавамі, хацела арганізаваць вайну. Але ёй гэта не ўдалося. І няхай запомняць паны фашысты, якія прагнуць народнай крыві, што паколькі іх спробы адносяцца да СССР, ім ніколі не ўдасца справакаваць вайну. Мы цвёрда пераконаны, што народныя масы ўсяго свету жадаюць міру, і совецкі ўрад няўхільна працуе над тым, каб яго ўмацаваць, зделкаючы рукі ўсім тым, хто падобна трацкістам, прабраўшыся на нашу зямлю, будзе распальваць пажар вайны.

Рабочыя і сяляне СССР многаму навучацца ў рэзультаце гэтага працэса, раскрыўшага клаку самых пёмных спраў, самых агідных злачынстваў, якія зрабілі трацкісты.

Працэс вучыць многаму. Ён перш за ўсё вучыць нас таму, каб мы ніадкладна выгналі з практыкі работы благадушнасць, фармальныя адносіны да справы.

Шэстовы і Пушыны толькі таму мелі магчымасць утойваць сваю шкодніцкую дзейнасць, што людзі, працаваўшыя з імі, слепа давяралі дакументам, складзеным гэтай бандай. Замест таго, каб разабрацца ў справе па сутнасці, вывучыць прычыны псавання машын, агрэгатаў, пажараў на заводах і т. д., людзі штампавалі гэтыя дакументы. Благадушнасць і перадавер'е — заўсёды былі спрыяючай атмасферай для злачынцаў.

Такая атмасфера часцей за ўсё бывае ў арганізацыях, дзе партыйная работа ідзе вяла, дзе самакрытыка не развіта, дзе людзі па-дзяляцку захапляючыся гаспадарчай работай, забываюць сваю асноўную ролю: быць палітычным кіраўніком мас у барацьбе за сацыялізм. Гэты ўрок рабочыя і сяляне не могуць не ўлічыць. Выгнаць самым рашучым чынам небольшэвіцкія адносіны да справы — дзяляцтва, фармалізм, штампаванне актаў, дакументаў — першы вывад, які павінны зрабіць для сябе рабочыя і сяляне і асабліва кіраўнікі прадпрыемстваў і ўстаноў.

Асноўная большэвіцкая якасць — пільнасць, здаровыя крытычныя адносіны да работніка, то там, то тут усё яшчэ падмяняюцца небольшэвіцкімі адносінамі, сямейнасцю, адносінамі па прынципу: «свой хлапец», «не падвядзе» і таму падобнымі дробнабуржуазнымі рысамі ў рабоце. Працэс з усёй яснасцю паказаў, да чаго гэта вядзе, што атрымліваецца ў арганізацыі, калі большэвіцкія прынципы ў рабоце падмяняюцца дробнабуржуазнымі.

Большэвізм — вораг расхлабанасці і сляпога давер'я. Асноўнай якасцю большэвіка, якую цяпер больш чым калі-б там ні было патрэбна падкрэсліць, з'яўляецца большэвіцкая пільнасць. Большэвіцкая пільнасці, умэнню крытычна адносіцца да людзей трэба вучыцца, трэба гэту якасць выхоўваць у людзях. Да гэтага абавязваюць нас вынікі працэса над антысовецкім цэнтрам, паказаўшым, які хітры і выкручлівы вораг, паказаўшым, што апрача выкрытых ворагаў ёсць яшчэ ворагі не выкрытыя.

Асабліва высока сцяг большэвіцкай пільнасці павінны трымаць мы, большэвікі Беларусі, партыйныя і непартыйныя. Ніколі нам не трэба забываць, што ўся работа наша працякае на рубяжы з капіталістычным захадам, ніколі не трэба забываць нам свайго святога абавязку: трымаць на моцным замку граніцы Саюза, не пакідаць адкрытай ні адной шчыліны, праз якую мог-бы прабрацца вораг па роду ці то трацкіст або наплём, правы або шпіён, шкоднік або дыверсант.

ПРЫВІТАННЕ тав. ЕЖОВУ З ЗАХОДНІХ ГРАНІЦ

Пагранічнікі чырвонасцяжнага пагранатрада, якім камандуе палкоўнік тав. Лопманаў, даведаўшыся аб прысваенні тав. Ежову звання генеральнага камісара дзяржаўнай бяспекі, на сваіх сходах аднагалосна парашылі паслаць наступнае прывітанне наркому:

— Мы, пагранічнікі чырвонасцяжнага атрада, горды давер'ем, аказаным партыяй і ўрадам нашаму наркому

Прысваенне гэтага высокага звання абавязвае нас, пагранічнікаў Совецкай Беларусі, удзесяцярыць свае сілы ў абароне недатыкальнасці нашых граніц, павысіць шматразова сваю большэвіцкую чэкісцкую пільнасць з тым, каб бязлітасна разіць ворага, пад якой-бы лічынай ён ні хаваўся.

Пачуццё радасці ахапіла нас, калі ЧКУС, пад вашым непасрэдным кіраўніцтвам выкрыў змову ізвергаў чалавецтва трацкісцкіх лакеяў фашызма, прэзрэнных рэстаўратараў капіталістычнага ладу.

Яны хацелі адняць у нас тое, што нам даражэй нашага жыцця — таварыша Сталіна і яго саратнікаў таварышоў Молатава, Варашылава, Кагановіча, Орджанікідзе, Ежова, Касіора, Постышэва, Эйхе і Берыя.

Ніколі не бываць гэтаму! — такі аднадушны голас пагранічнікаў Совецкай Беларусі.

Як сцяг на полі бою, асвяшчоны крывёю лепшых сыноў народу, паўшых у барацьбе з ворагамі, будзем ахоўваць жыццё правадыра і яго саратнікаў.

Ніколі не бываць таму, каб трацкісцкая гадзіна і яе паследышы маглі душыць нашу краіну. Сцерці іх з твару зямлі!

Няхай жыве і здраўствуе на многія гады сонца совецкай краіны, наш друг, настаўнік і правадыр — вялікі Сталін!

Няхай жывуць на радасць краіны сацыялізма — баявыя сталінскія саратнікі Молатаў, Варашылаў, Кагановіч, Орджанікідзе, Ежоў!

Сталінскаму наркому — генеральнаму камісару дзяржаўнай бяспекі таварышу Нікалаю Іванавічу Ежову з заходніх граніц Совецкай Беларусі — пагранічнае чэкісцкае «ўра»!

Пагранічнікі чырвонасцяжнага атрада, якім камандуе палкоўнік т. ЛОЦМАНАЎ

Цэнтральны камітэт комуністычнай партыі (большэвікоў) Беларусі глыбока сумуе з прычыны заўчаснай смерці

тав. ПАЛУНОВА МІРОНА ЛЬВОВІЧА

баявога камандзіра нашай Чырвонай Арміі, беззаветнага барацьбіта за справу партыі Леніна—Сталіна.

ЦК КП(б)Б.

Совет Народных Камісараў Беларускай ССР з жалем паведамляе аб смерці камандзіра-камісара Другой Беларускай стралковай чырвонасцяжнай дывізіі героя грамадзянскай вайны, адданага байца рэволюцыі ордэаноносца камбрыга

тав. ПАЛУНОВА МІРОНА ЛЬВОВІЧА

і выказвае спачуванне яго сям'і.

Совет Народных Камісараў БССР.

ПРАЦЭС АНТЫСОВЕЦКАГА ТРАЦКІСЦКАГА ЦЭНТРА

ПРЫГАВОР

ІМЕМ САЮЗА СОВЕЦКІХ СОЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ РЭСПУБЛІК

ВАЕННАЯ КАЛЕГІЯ ВЯРХОЎНАГА СУДА СССР У СКЛАДЗЕ:

Старшынствуючага—старшыні Ваеннай калегіі Вярхоўнага суда Саюза ССР армваенюрыста В. В. УЛЬРЫХ

Членаў: намесніка старшыні Ваеннай калегіі Вярхоўнага суда Саюза ССР корваенюрыста І. О. МАТУЛЕВІЧ і члена Ваеннай калегіі Вярхоўнага суда Саюза ССР дыўваенюрыста Н. М. РЫЧКОВА

Пры сакратару—ваенным юрысце 1 ранга А. Ф. КАСЦЮШКА

З удзелам дзяржаўнага абвінаваўпы — пракурора Саюза ССР тав. А. Я. **Вышынскага** і членаў маскоўскай калегіі абаронаў тт. І. Д. **Браудэ, Н. В. Камодава** і С. К. **Казначэева** — у адкрытым судовым пасяджэнні, у горадзе Маскве, 23 — 30 студзеня 1937 года, разгледзела справу па абвінавачанню:

1. **Пятакова**, Юрыя (Георгія) Леаніда-віча, 1890 г. нараджэння, служачага;
2. **Сакольнікава**, Грыгорыя Якаўлевіча, 1888 г. нараджэння, служачага;
3. **Радэка**, Карла Бернгардавіча, 1885 г нараджэння, журналіста;
4. **Серэбракова**, Леаніда Петровіча, 1888 г. нараджэння, служачага;
5. **Ліўшыца**, Якава Абрамавіча, 1896 г. нараджэння, служачага;
6. **Муралава**, Нікалая Іванавіча, 1877 г. нараджэння, служачага;
7. **Дробніса**, Якава Наумавіча, 1891 г. нараджэння, служачага;
8. **Багуслаўскага**, Міхаіла Саламонавіча, 1886 г. нараджэння, служачага;
9. **Князева**, Івана Александравіча, 1893 г. нараджэння, служачага;
10. **Ратайчака**, Станіслава Антонавіча, 1894 г. нараджэння, служачага;
11. **Норкіна**, Барыса Осіпавіча, 1895 г. нараджэння, служачага;
12. **Шэстова**, Алексея Александравіча, 1896 г. нараджэння, служачага;
13. **Страілава**, Міхаіла Сцяпанавіча, 1899 г. нараджэння, служачага;
14. **Турок** Іосіфа Дмітрыевіча, 1900 г. нараджэння, служачага;
15. **Грашэ**, Івана Іосіфавіча, 1886 г. нараджэння, служачага;
16. **Пушына**, Таўрыла Ефрэмавіча, 1896 г. нараджэння, служачага і
17. **Арнольда**, Валенціна Вольфрыдавіча, ён-жа **Васільеў** Валенцін Васільевіч, 1894 г. нараджэння, служачага — усіх у злачынствах, прадугледжаных арт. арт. 58-1-А, 58-8, 58-9 і 58-11 Крымінальнага Кодэкса РСФСР.

Папярэднім і судовым следствам устаноўлена:

У 1933 годзе, па прамому ўказанню высланага ў 1929 г. за межы СССР ворага народу Л. **Троцкага**, побач з існаваўшым, так званым «аб'яднаным трацкісцка-зіноўеўскім тэрарыстычным цэнтрам» у складзе **Зіноўева, Каменева, Смірнова** і іншых, быў створан у Маскве падпольны паралельны антысовецкі трацкісцкі цэнтр, у склад якога ўвайшлі падсудныя па данай справе Ю. Л. **Пятакоў**, К. Б. **Радэк**, Г. Я. **Сакольнікаў** і Л. П. **Серэбракоў**.

На падставе ўказанняў ворага народу Л. **Троцкага**, паралельны антысовецкі трацкісцкі цэнтр асноўнай сваёй задачай ставіў звяржэнне совецкай улады ў СССР і аднаўленне капіталізма і ўлады буржуазіі шляхам шкодніцкай, дыверсійнай, шпіёнскай і тэрарыстычнай дзейнасці, накіраванай на падрыў эканамічнай і ваеннай магутнасці Совецкага Саюза, паскарэнне ваеннага нападу на СССР, садзейнасць замежным агрэсарам і на паражэнне СССР.

У поўнай адпаведнасці з гэтай асноўнай задачай вораг народу Л. **Троцкі** за граніцай, а паралельны антысовецкі трацкісцкі цэнтр у асобе **Радэка** і **Сакольнікава**—у Маскве — уступілі ў перагаворы з асобнымі прадстаўнікамі Германіі і Японіі. Вораг народу Л. **Троцкі** ў часе перагавораў з адным з кіраўнікоў нацыянал-сацыялісцкай партыі Германіі Рудольфам **Гес** абяцаў у выпадку прыходу да ўлады трацкісцкага ўрада, у рэзультаце паражэння Совецкага Саюза, зрабіць Германіі і Японіі рад палітычных, эканамічных і тэрытарыяльных уступак за кошт СССР, аж да ўступкі Украіны — Германіі, Прымор'я і Прыамур'я—Японіі. Адначасова вораг народу Л. **Троцкі** абавязаўся, у выпадку захвату ўлады, ліквідаваць соўгасы, распусціць калгасы, адмовіцца ад палітыкі індустрыялізацыі краіны і рэстаўраваць на тэрыторыі Совецкага Саюза капіталістычныя адносіны. Апрача таго, вораг народу Л. **Троцкі** даў абавязацельства аказваць усямерную дапамогу агрэсарам шляхам развіцця паражэнчай агітацыі, шкодніцкай, дыверсійнай і шпіёнскай дзейнасці як у мірны час, так і, у асаблівасці, у часе іх ваеннага нападу на Совецкі Саюз.

Члены антысовецкага трацкісцкага паралельнага цэнтра **Пятакоў, Радэк, Сакольнікаў і Серэбракоў**, у выкананне ўказанняў ворага народу Л. **Троцкага**, неаднаразова атрымліваемых **Радэкам**, а таксама асабіста атрыманых **Пятаковым** пры яго сустрэчы з ворагам народу Л. **Троцкім** у снежні 1935 г. недалёка ад горада Осло,— разгарнулі шкодніцка-дыверсійную, шпіёнскую і тэрарыстычную дзейнасць.

Для непасрэднага кіраўніцтва антысовецкай дзейнасцю на месцах у некаторых буйных гарадах Совецкага Саюза былі створаны мясцовыя трацкісцкія цэнтры. А прыватнасці, у Новасібірску, па прамому ўказанню Пятакова, быў арганізован заходне-сібірскі антысовецкі трацкісцкі цэнтр у складзе падсудных па данай справе Н. І. **Муралава**, М. С. **Багуслаўскага** і Я. Н. **Дробніса**.

Дыверсійная і шкодніцкая работа ў прамысловасці, галоўным чынам, на прадпрыемствах абаронага значэння, а таксама на чыгуначным транспарце, праводзілася падсуднымі па данай справе па ўказаннях ворага народу **Троцкага** і па заданнях і пры прамым удзеле агентаў германскай і японскай разведак, і заключалася ў зрыве планаў вытворчасці, пагаршэнні якасці прадукцыі, у арганізацыі падпалаў і ўзрываў заводаў ці асобных цэхаў і шахт, у арганізацыі крушэнняў паязду, псаванні рухомага састава і чыгуначнага шляху.

Пры арганізацыі дыверсійных актаў падсудныя выходзілі з указанняў ворага народу **Троцкага** — «наносіць адчувальныя ўдары ў найбольш адчувальных месцах», даводзіўненых указаннямі **Пятакова, Ліўшыца** і **Дробніса**, не спыняцца перад чалавечымі афярамі, бо «чым больш афяр, тым лепш, бо гэта выкліча азлабленне рабочых».

У хімічнай прамысловасці, паводле заданняў **Пятакова**, падсудныя **Ратайчак** і **Пушыным** праводзілася шкодніцкая работа, накіраваная на зрыў дзяржаўнага вытворчага плана, на затрыманне будаўніцтва новых заводаў і прадпрыемстваў і на недобраякаснае будаўніцтва новых прадпрыемстваў.

Апрача таго, абвінавачваемыя **Ратайчак** і **Пушын** у 1934 —1935 гг. арганізавалі тры дыверсійныя акты на Горлаўскім азота-тукавым камбінаце, прычым два з іх са ўзрывамі, што пацягнула за сабой пагібель рабочых і прычыніла вялікія матэрыяльныя страты.

Дыверсійныя акты былі таксама арганізаваны па прапанове падсуднага **Ратайчака** на Васкрэсенскім хімічным камбінаце і Неўскім заводзе.

У вугальнай і хімічнай прамысловасці Кузнецкага басейна падсудныя **Дробніс, Норкін, Шэстоў** і **Страілаў**, паводле ўказанняў **Пятакова** і **Муралава**, праводзілі шкодніцкую і дыверсійную работу, накіраваную на зрыў здабычы вугалю, на затрыманне будаўніцтва і развіцця новых шахт і хімічнага камбіната, на стварэнне, шляхам загазавання забояў і шахт, шкодных і небяспечных для жыцця рабочых умоў работы, а 23 верасня 1936 года ўдзельнікамі мясцовай трацкісцкай арганізацыі, па заданню **Дробніса**, быў арганізован узрыў на шахце «Цэнтральная» Кемераўскага рудніка, які пацягнуў пагібель 10 рабочых і цяжкія раненні 14 рабочых.

На чыгуначным транспарце дыверсійная і шкодніцкая дзейнасць падсудных **Серэбракова, Багуслаўскага, Ліўшыца, Князева** і **Турок**, у адпаведнасці з устаноўкамі антысовецкага трацкісцкага цэнтра, была накіравана на зрыў дзяржаўнага плана пагрузкі, асабліва па галоўнейшых грузах (вугаль, руда, хлеб), на псаванне рухомага состава (вагоны, паравозы) чыгуначнага шляху і на арганізацыю крушэнняў паязду, асабліва вайсковых.

Падсудным **Князевым**, паводле ўказання **Ліўшыца** і задання агента японскай разведкі п. Х..., у 1935-36 гг. быў арганізован і праведзен рад крушэнняў таварных, пасажырскіх і вайсковых паездоў з чалавечымі афярамі, прычым крушэнне вайсковага эшалона на станцыі Шуміха 27 кастрычніка 1935 года пацягнула смерць 29 чырвонаармейцаў і раненне 29 чырвонаармейцаў.

Па прамому ўказанню ворага народу Л. **Троцкага**, членамі антысовецкага трацкісцкага цэнтра **Пятаковым і Серэбраковым**, на выпадак ваеннага нападу на СССР, падрыхтоўваўся рад дыверсійных актаў у прамысловасці, якая мае абаронае значэнне, а таксама на важнейшых магістралях чыгуначнага транспарту.

Падсудны **Норкін**, паводле ўказання **Пятакова**, падрыхтоўваў падпал Кемераўскага хімічнага камбіната к моманту пачатку вайны.

Падсудны **Князеў**, па даручэнню Ліўшыца, прыняў да выканання заданне агента японскай разведкі п. Х... арганізаваць у часе вайны ўзрывы чыгуначных пабудоў, падпалы вайсковых складаў і пунктаў харчавання войск, крушэнні вайсковых паездоў, а таксама праводзіць знарочытае заражэнне бактэрыямі вострازаразных хвароб падаваемых пад войскі эшалоны, а таксама пункты харчавання і санапрацоўкі часцей Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі.

Побач з дыверсійнай і шкодніцкай дзейнасцю падсудныя **Ліўшыц, Князеў, Турок, Страілаў, Шэстоў, Ратайчак, Пушын** і **Грашэ**, па даручэнню трацкісцкага антысовецкага цэнтра, займаліся зборам і перадачай агентам германскай і японскай разведак сакрэтных вестак, якія маюць важнейшае дзяржаўнае значэнне.

Падсудныя **Ратайчак, Пушын** і **Грашэ** былі звязаны з агентамі германскай разведкі **Мейеровіцц** і **Ленц**, якім у 1935 — 1936 гг. перадавалі асабліва сакрэтныя матэрыялы аб становішчы і рабоце хімічных заводаў, прычым **Пушын** у 1935 годзе перадаў агенту германскай разведкі **Ленц** сакрэтныя весткі аб выпрацоўцы прадукцыі на ўсіх хімічных прадпрыемствах Саюза ССР за 1934 год, праграму работ усіх хімічных прадпрыемстваў на 1935 год і план будаўніцтва азотных камбінатаў, а падсудны **Ратайчак** перадаў таму-ж **Ленц** зусім сакрэтныя матэрыялы аб прадукцыі за 1934 год і праграму работ на 1935 год па ваенна-хімічных заводах.

Падсудныя **Шэстоў** і **Страілаў** былі звязаны з агентамі германскай разведкі **Шэбеста, Флеса, Фларэн, Замерзгер** і інш і перадавалі ім сакрэтныя весткі па вугальнай і хімічнай прамысловасці Кузнецкага басейна.

Падсудныя **Ліўшыц, Князеў** і **Турок** сістэматычна перадавалі агенту японскай разведкі п. Х... зусім сакрэтныя весткі аб тэхнічным становішчы і мабілізацыйнай гатоўнасці чыгунак СССР, а таксама аб вайсковых перавозках.

Паводле прамых указанняў ворага народу Л. **Троцкага** антысовецкім трацкісцкім цэнтрам было створана некалькі тэрарыстычных груп у Маскве, Ленінградзе, Кіеве, Растове, Новасібірску, Сочы і іншых гарадах СССР, якія займаліся падрыхтоўкай тэрарыстычных актаў супроць кіраўнікоў ВКП(б) і совецкага ўрада таварышоў **Сталіна, Молатава, Кагановіча, Варашылава, Орджанікідзе, Ежова, Жданава, Касіора, Эйхе, Постышэва** і **Берыя**, прычым некаторымі тэрарыстычнымі групамі (у Маскве, Новасібірску, на Украіне, у Закаўказзі) непасрэдна кіравалі члены антысовецкага трацкісцкага цэнтра падсудныя **Пятакоў** і **Серэбракоў**.

Арганізуючы тэрарыстычныя акты, антысовецкі трацкісцкі цэнтр стараўся скарыстаць для гэтага выезды кіраўнікоў ВКП(б) і совецкага ўрада на месцы.

Так, увосень 1934 года **Шэстоў**, паводле ўказання **Муралава**, прабаваў ажыццявіць тэрарыстычны акт супроць старшыні Совета Народных Камісараў СССР тав. В. М. **Молатава** ў часе яго прабывання ў Кузбасе, для чаго ўдзельнік мясцовай трацкісцкай тэрарыстычнай групы падсудны **Арнольд** прабаваў зрабіць катастрофу з аўтамашынай, у якой ехаў тав. В. М. **Молатаў**.

Апрача таго, падсудны Шэстоў па заданню **Пятакова** і **Муралава** падрыхтоўваў тэрарыстычны акт супроць сакратара Заходне-Сібірскага краявога камітэта ВКП(б) тав. Р. І. **Эйхе**, а падсудны Арнольд, па падбухторванню таго-ж **Шэстова**, падрыхтоўваў тэрарыстычны акт супроць тав. Г. К. **Орджанікідзе**.

Такім чынам, Ваенная Калегія Вярхоўнага суда Саюза ССР устанавіла, што:

1. **Пятакоў, Серэбракоў, Радэк і Сакольнікаў** з'яўляліся членамі антысовецкага трацкісцкага цэнтра і паводле прамых указанняў ворага народу Л. **Троцкага**, які знаходзіцца за граніцай, у мэтах паскарэння ваеннага нападу на Совецкі Саюз, садзейнасці замежным агрэсарам у захвале тэрыторый Совецкага Саюза, звяржэння совецкай улады, аднаўлення капіталізма і ўлады буржуазіі, кіравалі здрадніцкай, дыверсійна-шкодніцкай, шпіёнскай і тэрарыстычнай дзейнасцю антысовецкай трацкісцкай арганізацыі ў Совецкім Саюзе, г. зн. зрабілі злачынствы, прадугледжаныя арт. арт. 58-1-А, 58-8, 58-9 і 58-11 Крымінальнага Кодэкса РСФСР.

II. Указаныя ў пункце 1 **Пятакоў і Серэбракоў**, а таксама **Муралаў, Дробніс, Ліўшыц, Багуслаўскі**, якія з'яўляліся ўдзельнікамі антысовецкай трацкісцкай арганізацыі — арганізавалі і непасрэдна накіроўвалі здрадніцкую, шпіёнскую, дыверсійна-шкодніцкую і тэрарыстычную дзейнасць членаў антысовецкай трацкісцкай арганізацыі, г. зн. зрабілі злачынствы, прадугледжаныя арт. арт. 58-1-А, 58-8, 58-9 і 58-11 Крымінальнага Кодэкса РСФСР.

III. **Князеў, Ратайчак, Норкін, Шэстоў, Турок, Пушын** і **Грашэ**, з'яўляючыся ўдзельнікамі антысовецкай трацкісцкай арганізацыі, прывялі ў выкананне заданні антысовецкага трацкісцкага цэнтра па здрадніцкай, шпіёнскай, дыверсійна-шкодніцкай і тэрарыстычнай дзейнасці, г. зн. зрабілі злачынствы, прадугледжаныя арт. арт. 58-1-А, 58-8, 58-9 і 58-11 Крымінальнага Кодэкса РСФСР.

IV. **Арнольд**, будучы ўдзельнікам антысовецкай трацкісцкай арганізацыі, па падбухторванню падсудных **Муралава** і **Шэстова**, імкнуўся ажыццявіць тэрарыстычныя акты супроць таварышоў **Молатава** і **Орджанікідзе**, г. зн. зрабіў злачынствы, прадугледжаныя арт. арт. 19-58-8 і 58-11 Крымінальнага Кодэкса РСФСР.

V. **Страілаў** — часткова выканаў некалькі асобных заданняў па шпіянажу і шкодніцтву, г. зн. зрабіў злачынствы, прадугледжаныя арт. арт. 58-6 і 58-7 Крымінальнага Кодэкса РСФСР.

На падставе сказанага і кіруючыся арт. арт. 319 і 320 Крымінальна-працэсуальнага Кодэкса РСФСР

Ваенная калегія Вярхоўнага суда Саюза ССР

ПРЫГАВАРЫЛА:

1. **Пятакова**, Юрыя (Георгія) Леаніда-віча;
2. **Серэбракова**, Леаніда Петровіча, як члена антысовецкага трацкісцкага цэнтра, арганізаваўшых і непасрэдна кіраваўшых здрадніцкай, шпіёнскай, дыверсійна-шкодніцкай і тэрарыстычнай дзейнасцю— да вышэйшай меры крымінальнага пакарання — **расстрэлу**;
3. **Муралава**, Нікалая Іванавіча;
4. **Дробніса**, Якава Наумавіча;
5. **Ліўшыца**, Якава Абрамавіча;
6. **Багуслаўскага**, Міхаіла Саламонавіча;
7. **Князева**, Івана Александравіча;
8. **Ратайчак**, Станіслава Антонавіча;
9. **Норкіна**, Барыса Осіпавіча;
10. **Шэстова**, Алексея Александравіча;
11. **Турок**, Іосіфа Дмітрыевіча;
12. **Пушына**, Таўрыла Ефрэмавіча і
13. **Грашэ**, Івана Іосіфавіча, як арганізатараў і непасрэдных выканаўцаў указаных вышэй злачынстваў — да вышэйшай меры крымінальнага пакарання — **расстрэлу**;
14. **Сакольнікава**, Грыгорыя Якаўлевіча і
15. **Радэка**, Карла Бернгардавіча — як члена антысовецкага трацкісцкага цэнтра, якія нясуць адказнасць за яго злачынную дзейнасць, але якія не прымалі непасрэднага ўдзелу ў арганізацыі і ажыццяўленні актаў дыверсійна-шкодніцкай, шпіёнскай і тэрарыстычнай дзейнасці — да зняволення ў турме тэрмінам на **10 год кожнага**;
16. **Арнольда**, Валенціна Вольфрыдавіча — да зняволення ў турме на **10 год**;
17. **Страілава**, Міхаіла Сцяпанавіча, з прычыны акалічнасцей, указаных у п. V рэзалюцыйнай часткі данага прыгавору — да зняволення ў турме **на 8 год**.

Асуджаных да турэмнага зняволення **Сакольнікава, Радэка, Арнольда і Страілава** пазбавіць палітычных правоў тэрмінам на 5 год кожнага.

Маемасць усіх асуджаных, асабіста ім належачую, — канфіскаваць.

Высланыя ў 1929 годзе за межы СССР і пазбаўленыя пастановай ПВК СССР ад 20 лютага 1932 года права грамадзянства СССР вораг народу Троцкі Леў Давыдавіч і яго сын **Седоў** Леў Львовіч, выкрытыя паказаннямі падсудных Ю. Л. **Пятакова, К. Б. Радэка**, А. А. **Шэстова** і Н. І. **Муралава**, а таксама паказаннямі дапытаных на судовым пасяджэнні ў якасці сведак В. Г. **Рома** і Д. П. **Бухарцэва** і матэрыяламі данай справы ў непасрэдным кіраўніцтве здрадніцкай дзейнасцю трацкісцкага антысовецкага цэнтра, у выпадку іх выяўлення на тэрыторыі Саюза ССР, — падлягаюць неадкладнаму арышту і аддаванню пад суд Ваеннай калегіі Вярхоўнага суда Саюза ССР.

Старшынствуючы — старшыня Ваеннай калегіі Вярхоўнага суда СССР армваенюрыст—В. УЛЬРЫХ.

Члены: — Намеснік старшыні Ваеннай калегіі Вярхоўнага суда СССР корваенюрыст — І. МАТУЛЕВІЧ.

Член Ваеннай калегіі Вярхоўнага суда СССР дыўваенюрыст — Н РЫЧКОЎ.

ПРАЦЭС АНТЫСОВЕЦКАГА ТРАЦКІСЦКАГА ЦЭНТРА

Прамова абаронцы тав. І. Д. Браудэ

Старшынствуючы тав. Ульрых пытаецца кожнага з падсудных — Пятакова, Радэка, Сакольнікава, Серэбракова, Багуслаўскага, Дробніса, Муралава, Норкіна, Шэстова, Ратайчака, Страілава, Ліўшыца, Турок і Грашэ, маючых права абарончай прамовы, — ці не жадаюць яны скарыстаць гэта права. Усе пералічаныя падсудныя ад абарончай прамовы адмаўляюцца.

Старшынствуючы: Слова мае тав. Браудэ, абаронца падсуднага Князева.

Браўдэ: Таварышы суддзі, я не буду скрываць ад вас таго выключна цяжкага, небывала цяжкага становішча, у якім знаходзіцца ў гэтай справе абаронца.

Але, таварышы суддзі, волю совецкага закона, волю Сталінскай Канстытуцыі, якая забяспечвае кожнаму абвінавачваемаму, незалежна ад цяжару зробленага злачынства, права на абарону, наш грамадзянскі і прафесіянальны доўг—дапамагчы ў ажыццяўленні гэтага права тым абвінавачваемым, якія пажадалі гэта права на абарону скарыстаць.

Я абараняю Князева, начальніка чыгункі, які ва ўгоду японскай разведцы пускаў пад адкос паязды з рабочымі і чырвонаармейцамі.

Тав. Браудэ гаворыць, што Князеў рабіў найпяжэйшыя злачынствы. Але асноўны віноўнік — той, хто з'яўляецца тварцом гнуснай з'явы, называемай трацкізмам, — Троцкі. Князеў быў толькі выканаўцай. У яго няма вопыту шматгадовай барацьбы з партыяй, як у многіх з абвінавачваемых, якія знаходзяцца з ім на адной лаве падсудных. Ён, па сутнасці кажучы, малады трацкіст.

У Князева былі вядомыя сумненні ў 1930 годзе, але тады ён адмовіўся ўступіць у трацкісцкую арганізацыю, у якую ўцягваў яго абвінавачваемы Турок. У тым-жа годзе з ім вёў перагаворы п. Х..., імкнучыся завербаваць Князева на работу для японскай разведкі. Князеў адказаў яму катэгарычна рэзкім адмаўленнем, але нікому пра гэты выпадак не расказаў.

І вось праз чатыры гады зноў да Князева з'явіўся Турок і зноў паставіў перад Князевым пытанне, каб той увайшоў у трацкісцкую арганізацыю. Турок сказаў: я ведаю пра тыя размовы, пра тыя прапановы, якія рабіліся табе японскім шпіёнам у 1930 г., і калі ты не ўступіш у трацкісцкую арганізацыю, то я цябе аддам пад суд і як скрытага трацкіста, і як шпіёна. Такім-жа метадам праз поўгода Князеў быў заняроблен п. Х... на работу ў японскую разведку.

У чым-жа я бачу яшчэ моманты, якія даюць падставы для змякчэння яго лёсу? Гэта — поўнае і сапраўды чыстасардэчнае прызнанне сваёй віны.

Ілюзіі знішчаны... Засталіся факты ва ўсёй іх непрыкрытай мярзотнасці. Замест нібы правадыроў, за якімі Князеў ішоў, на лаўцы падсудных аказаліся палітычныя банкроты і здраднікі ва ўсёй іх непрыгляднай нагаце. Гэты страшны ўрок не можа не адштурхнуць ад смуроду контрреволюцыі і такіх людзей, як Князеў, на гледзячы на цяжар іх непасрэдных злачынстваў.

Хочацца верыць у шчырасць прызнанняў Князева. І гэта дае мне права прасіць вас абмеркаваць пытанне аб магчымасці захавання Князеву жыцця.

Прамова абаронцы тав. С. К. Казначэева

Старшынствуючы: Слова мае абаронца падсуднага Арнольда — член калегіі абаронцаў тав. Казначееў.

Казначэеў: Таварышы суддзі, страшэнна карціна здрады і здраднічства, якая разгарнулася перад намі на працягу гэтых некалькіх дзён. Бязмерны цяжар віны седзячых на лаве падсудных. Зразумелы гнеў народных мас нашага Саюза.

З выключнай пераканальнасцю і яснасцю ўскрыліся тут на судзе як сама работа трацкісцкай арганізацыі, так і метады, якія ўжывала яна для ўцягвання ў сваё асяродзе. Фактычны бок гэтай справы ўстаноўлен не толькі прызнаннем абвінавачваемых па справе, але і той сумай доказаў злачынства, якая ёсць у вашым распараджэнні. Кола аргументаў, якія можна прапанаваць вашай увазе, кола доваду, якія могуць быць высунуты, як моманты, што змякчаюць віну таго або іншага абвінавачваемага па гэтай справе, — надзвычайна звужваецца.

Па першы погляд здаецца незразумелым, як здарылася, што Арнольд, у якога, па сутнасці кажучы, ніякай палітычнай арыентацыі раней не было, стаў суўдзельнікам людзей, маючых вялікі актыў палітычнага двурушніцтва на працягу пэлага раду гадоў.

У сваіх паказаннях Шэстоў цынічна расказвае аб тым, як яму прыходзілася ўцягваць у арганізацыю Арнольда. Ён гаворыць: «Я яго паступова падкармліваў. Я яго прымацаваў незаконна на снабжэнне ў інснаб, я матэрыяльна яму дапамагаў, я клапаціўся аб яго сям'і. Я высветліў яго дрэннае мінулае і пагражаў яму». Пад уплывам гэтых пагроз Арнольд у арганізацыю ўступіў.

Ад Арнольда патрабавалі самаафіравання. Арнольд даў цвёрдае абяцанне афіраваць сабой. У трусасці Арнольда, у тым, што ён спрабаваў ашукаць трацкісцкую арганізацыю, у значнай ступені трэба шукаць прычыну таго, што тэрарыстычныя акты не былі ажыццёўлены! «Я, як ніколі ў жыцці, спалохаўся...» «Я не хацеў памерці або застацца калекай». Вось матывы, якія кіравалі Арнольдам.

Перад намі няўхільна павінна паўстаць пытанне: ці зрабіў Арнольд хоць-бы адну спробу з гэтай арганізацыі выйсці, парваць з ёй? Калі ў яго такія спробы сапраўды былі, то яны ў даным выпадку з'яўляюцца чымсьці важкім і ва ўсякім выпадку такім, што павінна быць улічана пры вырашэнні пытання аб яго далейшым лёсе. Мы ведаем па справе, што Арнольд паехаў у Ташкент, паехаў у Маскву, што ён парваў з Чэрэпухіным. Мы ведаем, што гэты адыход пацвярджаецца.

Якім-бы ні быў, таварышы суддзі, непрыглядным воблік абвінавачваемага Арнольда, мне думаецца, што гэты самы Арнольд, які пачаў сваё жыццё з брадзяжніцтва, вядома, у вялікай ступені афіра трагічнага ашуканства, аб якім гаварыў тут абвінавачваемы Багуслаўскі. Арнольд —адна з афіар ашуканства трацкісцкіх генералаў.

Доказная сітуацыя справы зусім ясна. Але, мне здаецца, сярод усіх членаў трацкісцкай арганізацыі, як тых, што сядзяць на лаўцы падсудных, так і тых, якія не сядзяць, абвінавачваемы Арнольд — адзін з персанажаў самых нязначных, і ён адносіцца да разраду тых, хто можа быць толькі выканаўцам у гэтай арганізацыі. Трэба прызнаць, што належнага палітычнага выхавання ён не атрымаў і апошні палітычны ўрок ён атрымаў на гэтым працэсе.

Дазвольце мне, таварышы суддзі, думаць, што калі вы ў дарадчым пакоі будзеце вырашаць пытанне аб лёсе Арнольда, аб тым, жыць далей Арнольду або не жыць, то вы ўсе гэтыя моманты ўлічыце.

Вось таварышы суддзі, да чаго зводзіцца мая просьба.

Пасля прамовы абаронцы т. Казначэева старшынствуючы т. Ульрых абяўляе перапынак да 11 гадзін 29 студзеня.

(БЕЛТА).

РАНІШНЯЕ ПАСЯДЖЭННЕ 29 СТУДЗЕНЯ

Прамова абаронцы тав. Н. В. Камодава

Старшынствуючы: Слова мае абаронца падсуднага Пушына — член калегіі абаронцаў тав. Камодаў.

Камодаў: Барацьба з совецкай уладай, таварышы суддзі, як вы ведаеце, пачалася зараз-жа пасля прыходу гэтай улады. Барацьба была цяжкай, упартай. Вораг быў разгромлен.

Гэтыя перамогі звузілі кола ворагаў, пашырылі кола прыяцеляў. Найбольш дальнабачныя, найбольш чэсныя зразумелі, што, калі совецкую ўладу нельга апракінуць сілай зброі, калі народная гаспадарка не падламалася пад цяжарам труднасцей, значыць, гэта ўлада карэннямі сваімі ўвайшла ў гушчу народнага жыцця. Але астаткі разбітага класавага ворага не склалі зброі.

Пачаліся фракцыйныя выступленні трацкісцкай апазіцыі, аб якіх тут гаварыў дзяржаўны абвінаваўца. З самага пачатку гэтыя выступленні трацкісцкай апазіцыі сталі пунктам прылажэння ўсіх контрреволюцыйных сіл. Контрреволюцыянэры ўсіх адценняў ацэньвалі трацкізм не толькі як надзею на падзенне совецкай улады, але і надзею на рэстаўрацыю капіталізма.

Глыбока быў праў тав. Вышынскі, калі характарызаваў гэту барацьбу, як барацьбу двух сістэм. Гэта барацьба двух светапогляду, і такой яна застаецца да апошняга дня. Паколькі найбольш актыўным абаронцам ранейшай сістэмы вытворчых адносін у іх горшым выражэнні з'яўляецца зараз фашызм, адсюль зразумела, чаму фашызм падаў руку трацкізму, а трацкізм—фашызму, і яны заключылі саюз для сумеснай эксплаатацыі, насілля і рабства.

Трэба зразумець нас. Нам не лёгка. Калі мы, абаронцы, у гэтым працэсе будзем прасіць вас, таварышы суддзі, адступіць у адносінах таго або іншага падсуднага ад той вышэйшай меры пакарання, якую прапанаваў дзяржаўны абвінаваўца, то не з падстаў, якія ляжаць у характары злачынства або ў асобе падсуднага, а з падстаў, якія выцякаюць з самага факту сілы, магутнасці і моцы Совецкага Саюза. І гэта аснаўны наш довад у абароне. Да гэтага аснаўнага доваду абарона ў адносінах абараняемага мною Пушына прыходзіць, грунтуючыся таксама і на яго малой вазе ў яго-ж уласнай арганізацыі. Я не магу мірыцца з тым, каб паставіць усіх падсудных па іх удзельнай вазе на адну дошку.

Таварыш пракурор пры допыце тут на судзе Пушына запытаў яго: «А ці ведалі вы аб існаванні паралельнага цэнтра?» Пушын адказаў: «Я не ведаў». І гэтаму можна паверыць, бо ні з кім-жа з іх, з главароў, ён не быў звязан непасрэдна. Ён не быў і ў курсе ўсіх тых дырэктыў, якія праводзіліся цэнтрам.

Не забудзьце, таварышы суддзі, што ў моры жахлівых злодзеянняў у Пушына ёсць яшчэ адзін прасвет. Ён не быў ніякім, не толькі прамым, але і ўскосным шляхам звязан з той дырэктывай, упамінанне аб якой ледзяніць нашу кроў. Я маю на ўвазе тэрарыстычныя акты.

Мы, абаронцы, у гэтым працэсе па крушінках у літаральным сэнсе слова можам збіраць станоўчае наконт таго або іншага падсуднага.

Гэтыя крупінкі ў справе Пушына я бачу ў тым, што яго ўдзельная вага ў трацкісцкай арганізацыі была нязначная. Але я павінен сказаць больш. Усё тое, што складае змест і аб'ект яго віны, было ім самім дано ў паказанні 22 кастрычніка, у дзень яго арышту, прычым з усімі дэталямі. Праз некалькі гадзін пасля арышту ён напісаў уласнаручнае пісьмо, і ён расказаў усё, прычым з такімі дэталямі, якія не пакідаюць ніякага сумнення ў праўдзівасці, шчырасці і адкрытасці гэтых паказанняў.

Дазвольце мне напомніць вам адзін выпадак. Мы ведаем, што ў вялікім будаўніцтве шмат людзей перакоўвалася. Вось тут быў расказан трагічны выпадак з інжынерам Баяршынавым. Я памятаю яго вельмі добра. Ён стаіць перада мной, як жывы, на шахцінскім працэсе. Ён быў тады шкоднікам. Але вы бачылі, з якой шчырасцю, з якой чэснасцю гэты былы шкоднік стаў выдатным совецкім работнікам. За час працэса я прачытаў водгукі аб ім яго таварышоў па рабоце. Яны са зразумелым жахам пісалі аб тым страшэнным злодзеянні, якое было зроблена ў Сібіры, калі гэты былы шкоднік, стаўшы чэсным работнікам, быў раздаўлен грузавым аўтамабілем.

Хто ведае, можа быць, тое ўласнаручнае пісьмо, якое ў першыя-ж гадзіны пасля арышту пісаў Пушын, тыя паказанні, якія ён даваў, паказанні надрабязныя і чыстасардачныя, і з'явіліся водгукам таго ўнутранага пералому, які намячаўся раней.

Я дазволю ўказаць, што фактычна Пушын адышоў ад работы трацкістаў яшчэ ўвосень 1935 года. Тав. Вышынскі запытаў — можа быць таму, што вы не атрымлівалі задання? Ну, няхай хоць-бы таму, але ён-жа меў магчымасць праявіць уласную ініцыятыву. Калі ён у ліпені 1936 года прыехаў у Каменскі камбінат і сустрэўся там з людзьмі, якіх ён-жа завербаваў у трацкісцкую арганізацыю, ён толькі здалёк, мімаходам з імі прывітаўся, яму не хацелася гаварыць аб шкодніцтве. Гэта версія не была прыўнесена тут на судзе, яна дастаткова паўторана ў яго паказаннях ад 17 студзеня 1937 года. Гэта дробязь важна ў сэнсе характарыстыкі шчырасці, у сэнсе праўдзівай ацэнкі даных паказанняў.

У апошні год ні па лініі шкодніцтва, ні па лініі перадачы вестак вы не знойдзеце нідзе ні аднаго моманту, які-б можна было крыміналізаваць Пушыну. Гэта — таксама станоўчы момант. Я думаю, вось гэта сукупнасць невялікіх станоўчых рысаў дае мне права прасіць, а вам права, можа быць, задаволіць маю просьбу, адступіць ад той вышэйшай меры пакарання, якую ў адносінах Пушына прапанаваў дзяржаўны абвінаваўца.

Старшынствуючы: Пераходзім да апошніх слоў. Падсудны Пятакоў, маеце апошнае слова.

Апошняе слова падсуднага Пятакова

Грамадзяне суддзі! Я адмовіўся ад абарончай прамовы таму, што дзяржаўнае абвінавачанне было права ў сэнсе ўстанаўлення фактаў і ў сэнсе кваліфікацыі майго злачынства. Але я не магу згадзіцца са сцвярджэннем дзяржаўнага абвінаваўцы, што я і зараз застаюся трацкістам. Так, я быў трацкістам на працягу многіх гадоў, рука аб руку я ішоў разам з трацкістамі. Але-ж адзіным матывам, які пабудзіў мяне даць тыя паказанні, якія я даваў, было жаданне, хоць-бы зараз, хоць-бы занадта позна, вызваліцца ад свайго злачынага трацкісцкага мінулага.

Не пазбаўляйце мяне права на ўсведамленне таго, толькі на ўсведамленне таго, што хоць-бы і занадта позна, але я ўсё-такі гэту гразь, гэту мерзасць з сябе выкінуў.

Было-б няправільна думаць, што, калі пачыналася мая трацкісцкая дзейнасць, я ведаў, да чаго ўсё гэта прывядзе, што я суб'ектыўна ставіў сабе контрреволюцыйныя задачы і ўсведамляў, у якое балота мерзасці, злачынстваў мы ўрэшце прыдзем.

Так, я зрабіў адзін раз спробу адысці ад трацкізма. Гэта былі 1928-30 гг., і гэта спроба не была даведзена да канца. Засталася ядавітая заноза астаткаў трацкісцкай ідэалогіі. Далей вакол гэтага разрастаўся той злякасны нарыў, які прывёў мяне на шлях злачынстваў, прадажніцтва, здраднічства.

Грамадзяне суддзі, хоць я і злачынца, але я чалавек. Я-ж разумеў, я-ж бачыў, што мы — група трацкістаў — перадавы атрад фашысцкай контрреволюцыі, што мы нашымі шкодніцкімі дзеяннямі не можам, хоць-бы на ідэту змяніць аб'ектыўны ход развіцця прамысловасці, гаспадаркі. Але так было. Я не знайшоў у сябе ні дастатковай мужнасці, ні дастатковай цвёрдасці, каб стаць на шлях добраволнага расказу аб сваёй дзейнасці, выдачы арганізацыі і выдачы ўсяго таго, што я зрабіў у мінулым.

Адбыўся арышт. Арышт паставіў перада мной дылему: або далей да канца заставацца ворагам, не прызнаўшымся, не раскрыўшымся, або стаць на той шлях, на які я стаў.

Я не стану гаварыць, грамадзяне суддзі, — было-б смешна тут аб гэтым гаварыць,—што, разумеецца, ніякія метады рэпрэсіі ці ўздзеяння ў адносінах мяне не прымаліся. Ды гэтыя метады для мяне асабіста, па крайняй меры, не магі-б з'явіцца пабуджальнымі матывамі для дачы паказанняў. Не страх з'яўляўся пабуджальным матывам для расказу аб сваіх злачынствах. Што можа быць горш самога ўсведамлення і прызнання ва ўсіх тых злачынствах, найцяжэйшых і найшкаднейшых, якія прышлося рабіць! Усякае пакаранне, якое вы вынесеце, будзе лягчэй, чым самы факт прызнання. Вось чаму я не мог памірыцца са сцвярджэннем дзяржаўнага абвінавачання, што і зараз, на лаве падсудных, я, як быў, так і застаўся трацкістам.

І вось, калі я нясу поўную крымінальную адказнасць па совецкіх законах перад совецкім судом за свае злачынствы, калі мы адказваем у поўнай меры за ўсе сваё дзеянні — той, у імя якога мы гэта рабілі, па прамых указаннях і намаўленнях якога мы ўсе гэта рабілі, той,— ведаючы яго вельмі добра, я думаю, — не знойдзе нічога іншага, як адмовіцца ад таго, што мы рабілі разам з ім і пад яго кіраўніцтвам; ён будзе паклёпнічаць на нас, хлусіць, абвінавачаць у трусасці і ў чым угодна іншым. Я ведаю Троцкага занадта добра, каб сумнявацца ў гэтым. Замест таго, каб тут на судзе з вока на вока абвергнуць, ці кінуць мне гэтыя абвінавачанні, якія ён, несумненна, будзе кідаць, замест вочнай стаўкі з намі, вядома, лягчэй, прасцей і безапасней прадаўжаць сваю шкодніцкую работу.

Мяне асабіста, грамадзяне суддзі, гэта вельмі мала трывожыць. Я толькі глыбока шкадую, што разам з намі на лаве падсудных не сядзіць гэты асноўны злачынца, нераскаяўшыйся, злачынца да канца, якім з'яўляецца Троцкі.

Я занадта востра ўсведамляю свае злачынствы і не адважваюся прасіць у вас спагады. Я не адважваюся прасіць у вас нават літасці.

Праз некалькі гадзін вы вынесеце ваш прыгавор. І вось я стаю перад вамі ў брудзе, раздаўлены сваімі ўласнымі злачынствамі, пазбаўлены ўсяго па сваёй уласнай віне, — страціўшы сваю партыю, не маючы прыяцеляў, згубіўшы сям'ю, згубіўшы самога сябе...

Не пазбаўляйце мяне аднаго, грамадзяне суддзі! Не пазбаўляйце мяне права на ўсведамленне, што і ў вашых вачах, хоць-бы і занадта позна, я знайшоў у сабе сілы парваць са сваім злачынным мінулым.

Апошняе слова падсуднага Радэка

Старшыня: Падсудны Радэк, маеце апошняе слова.

Радэк: Грамадзяне суддзі! Пасля таго, як я прызнаў віноўнасць у здрадзе радзімэ, усякая магчымасць абарончых прамоў выключана. Няма такіх аргументаў, якімі дарослы чалавек, не пазбаўлены свядомасці, мог-бы абараніць здраду радзіме. На змякчаючыя віну акалічнасці прэтэндаваць таксама не магу. Я нават не магу спасланца на тое, што мяне звёў са шляху правільнага Троцкі. Я пайшоў з трацкісцкай арганізацыяй нэ ў імя тэорыйкі Троцкага, гніласць якой я зразумеў даўно, і не ў імя прызнання яго аўтарытэта правадыра, а таму, што другой групы, на якую я-б мог абапірацца ў тых палітычных мэтах, якія я сабе ставіў, не было, а з гэтай групай я быў звязан у мінулым, і таму я з ёю пайшоў.

На гэтым я-б мог скончыць сваё апошняе слова, калі-б не лічыў неабходным пярэчыць супроць асвятлення працэса (асвятлення частковага, не ў асноўным пункце), данага тут дзяржаўным абвінаваўцай, якое мне прыходзіцца адхіліць не з пункту гледжання асабіста майго, а з пункту гледжання палітычнага. Я прызнаў сваю віну і даў поўныя паказанні, выходзячы не з простай патрэбнасці раскаяцца. Раскаянне можа быць унутраным усведамленнем, якім можна не дзяліцца, нікому нэ паказваць, — не з любві наогул да праўды, — праўда гэта вельмі горкая, — а я павінен прызнаць віну, выходзячы з ацэнкі той агульнай карысці, якую гэта праўда павінна прынесці. І калі я чуў, што на лаве падсудных сядзяць проста бандыты і шпіёны, то я супроць гэтага пярэчу. Пярэчу не з пункту гледжання абароны сябе, а справа заключаецца ў наступным.

Працэс гэты паказаў два буйныя факты: спляценне контрреволюцыйных арганізацый з усімі контрреволюцыйнымі сіламі краіны. Гэта адзін факт. Але працэс мае другое велізарнае значэнне. Ён паказаў кузню вайны, ён паказаў, што трацкісцкая арганізацыя стала агентурай тых сіл, якія падрыхтоўваюць новую сусветную вайну.

Зразумела, дзяржаўны абвінаваўца і суд, якія ведаюць усю гісторыю трацкізма, не маюць ніякай прычыны падазраваць, што мы, несучы на спіне ярмо тэрору, яшчэ для прыемнасці прысвоілі сабе дзяржаўную здраду. Пераконваць у гэтым вас няма ніякай патрэбы. Трэба пераканаць, па-першае, распыленыя, брадячыя трацкісцкія элементы ў краіне, якія не склалі яшчэ зброі, што мы тут гаворым, патрэсеныя да глыбіні, і гаворым праўду і толькі праўду. І трэба яшчэ паказаць усяму свету тое, што Ленін — я з дрогатам вымаўляю яго імя з гэтай лавы — у пісьмэ, у дырэктывах для делегацыі, якая накіроўвалася ў Гаагу, пісаў аб тайнэ вайны. Кусок гэтай тайны знайшоўся ў руках сербскага маладога соцыяліста Гаўрылы Прынцыпа, які мог памерці ў крэпасці, не раскрыўшы яе. Ён быў сербскі нацыяналіст і адчуваў сваю правату, змагаючыся за тайну, якую ахоўваў сербскі нацыянальны рух. Я-ж не магу ўтоіць гэту тайну. І калі-б я гэту праўду схаваў і з ёй зышоў са сцэны, як гэта зрабіў Каменеў, як гэта зрабіў Зіноўеў, як гэта зрабіў Мрачкоўскі, то я, калі перадумваў гэта ўсё, у прадсмяротную гадзіну чуў-бы яшчэ праклянце тых людзей, якія будуць забіты ў будучай вайне і якім я мог маімі паказаннямі даць сродкі барацьбы супроць рыхтуючайся вайны.

Вось чаму я асцярэчваю сцвярджэнне, што на лаве падсудных сядзяць крымінальнікі, якія страцілі ўсё чалавечае. Я змагаюся не за сваю чэсць. Я яе згубіў. Я змагаюся за прызнанне праўдай тых паказанняў, якія я даў. Частка маіх суабвінавачаемых вярнуліся на шлях барацьбы, як перакананыя трацкісты, якія стаяць на пункце гледжання перманентнага адмаўлення магчымасці пабудовы соцыялізма ў адной краіне. Я вярнуўся, разуверыўшыся ў гэтай канцэпцыі Троцкага, вярнуўся, змаладушнічаў перад труднасцямі соцыялізма ў 1931-33 г. На гэтым я спатыкнуўся і пайшоў назад у падполле.

І якая карціна перада мной? Першы этап. Кіраў забіт. Гады тэрарыстычнай падрыхтоўкі, дзесяткі бадзяжных тэрарыстычных груп, якія ідуць на вёсць, каб ухіляць аднаго з кіраўнікоў партыі, і разультаты тэрору — утрата чалавечага жыцця без усякіх палітычных вынікаў для нас. Нельга паваліць совецкую ўладу тэрорам, нават з дапамогай самых адданых, адчаяных тэрарыстычных груп. Гэта ўтопія.

Старыя трацкісты выходзілі з таго, што немагчыма пабудова соцыялізма ў адной краіне, таму трэба фарсіраваць рэвалюцыю на Захадзе. Цяпер ім падносяць: на Захадзе рэвалюцыя немагчыма, таму разбурайце рэвалюцыю ў адной краіне, разбурайце соцыялізм у СССР.

Усё тое, што гаварыў грамадскі абвінаваўца аб рэстаўратарскім характары не толькі дырэктыў Троцкага, але ўсёй работы трацкістаў, — праўда. Самі дырэктывы былі дырэктывамі на поўнае аднаўленне капіталізма. Але гэтыя дырэктывы не ўпалі з неба, яны падагулялі тое, што калі людзі страляюць у штаб рэвалюцыі, калі людзі падрываюць народную гаспадарку, то яны падрываюць соцыялізм, а раз так, яны працуюць на капіталізм.

Грамадзяне суддзі, я павінен сказаць пяпер аб закулісным баку той нарады, якую мы хацелі склікаць. Чаму яна не адбылася?

Я буду аб гэтым гаварыць таму, што гэта можа мець у далейшым практычнае значэнне, і ёсць адказ на пытанне, ці не асталося яшчэ чаго-небудзь скрытага.

Я некалькі вярнуся да прозвішча Дрэйцэра. Калі Дрэйцэр на працягу 7—8 месяцаў нэ з'яўляўся ў Маскве, я мог думаць, што гэта канспірацыя. Але калі Дрэйцэр не з'явіўся і ў студзені, і атрымаўшы ад мяне заклік прыехаць на нараду, прыехаў у Маскву і не з'явіўся, — ён быў у Маскве ў 1935 г. і не з'явіўся, — для мяне стала ясна, што Троцкі, на аснове той перапіскі, якую меў з намі, бачачы адпор Пятакова і сумненні нашы наконт пераражэнчай лініі, — стварае нароўні з паралельным цэнтрам якуюсьці новую чартаўшчыну. Я гэта бачу ў тым, што Дрэйцэр у 1935 годзе прайшоў міма нас. Гэта азначае, што тут дзейнічала якаясьці трэцяя арганізацыя. І, нарэшце, калі Пятакоў вярнуўся з-за граніцы, ён кінуў мелькам, што Троцкі яму паведаміў, што стварацца новыя кадры людзей. Але калі я прачытаў аб Ольбергу і запытаў іншых, ці ведае хто-небудзь аб існаванні Ольберга, — а аб ім ніхто не ведаў, — для мяне стала ясным, што Троцкі стварае тут, паміма кадраў, прайшоўшых яго школу, арганізацыю агентуры, прайшоўшую школу германскага фашызма.

Калі стала пытанне аб нарадзе, для мяне было ясна, што калі Дрэйцэр даведаецца аб тым, што мы паставім пытанне аб дырэктывах Троцкага ў такой плоскасці і што гэта можа прывесці зноў да расколу, як у 1929 годзе,—то раней чым мы паставім гэта пытанне, нас ужо, ужо не будзе. Не таму, што Дрэйцэр дрэнна да нас адносіўся, але таму, што ён быў самым верным чалавекам Троцкага і ён меў непасрэдна больш цесную сувязь з ім, паміма нас. Вось чаму я не мог ніяк гаварыць людзям аб сходзе.

Калі я ставіў пытанне аб нарадзе, то я хацеў размежавання, каб аддзяліліся тыя, якія хацелі ісці да канца, тых можна выдаць, нават звязаных. А тым, другім, даць магчымасць адыйсці і даць магчымасць самім заявіць аб сваёй віне ўраду.

Я прызнаю за сабой яшчэ адну віну: я, прызнаўшы ўжо сваю віну і раскрыўшы арганізацыю, ударта адмаўляўся даваць паказанні аб Бухарыне. Я ведаў, што становішча Бухарына такое-ж безнадзейнае, як і маё, бо віна ў нас, калі не юрыдычна, то па сутнасці, была тая-ж самая. Але я з ім — блізкія прыяцелі, а інтэлектуальная дружба мацней, чым іншыя дружбы. Я ведаў, што Бухарын у тым-жа становішчы патрасення, што і я, і я быў пераконан, што ён дасць чесныя паказанні совецкай уладзе. Таму я не хацеў прыводзіць яго звязанага ў наркамат унутраных спраў. Я таксама, як і ў адносінах нашых астатніх кадраў, хацеў, каб Бухарын сам мог скласці зброю.

І вось, грамадзяне суддзі, я канчаю гэта апошняе слова наступным. Мы будзем адказваць па ўсёй строгасці совецкага закона, лічачы, што ваш прыгавор, які ён будзе, справядлівы. Тым элементам, якія з намі былі звязаны, мы хочам сказаць.

Першае: трацкісцкая арганізацыя стала цэнтрам усіх контрреволюцыйных сіл; правая арганізацыя, якая з ёй звязалася і была на шляху зліцця, таксама з'яўляецца цэнтрам усіх контрреволюцыйных сіл у краіне. З гэтымі тэрарыстычнымі арганізацыямі дзяржаўная ўлада справіцца, у гэтым мы не маем, на падставе ўласнага вопыту, ніякага сумнення. Але ёсць у краіне частка трацкістаў, якія нам дапамагалі, не ведаючы тэрарыстычнай арганізацыі, а сімпатызуючы нам, людзі, якія з-за лібералізма давалі гэту дапамогу. Усім гэтым элементам перад тварам суда мы гаворым: хто мае малейшую трэшчыну ў адносінах да партыі, хай ведае, што заўтра ён можа быць дыверсантам, можа быць здраднікам, калі гэта трэшчына не будзе старанна да канца задзелана адкравеннасцю перад партыяй.

Другое: Мы павінны сказаць трацкісцкім элементам у Францыі, Іспаніі і іншых краінах: вопыт рускай рэвалюцыі паказаў, што трацкізм — шкодник рабочага руху. Мы павінны іх перасперагчы, што і яны будуць расплачвацца сваімі галовамі, калі не будуць вучыцца на нашым вопыце.

І, нарэшце, усяму свету, усім, якія змагаюцца за мір, мы павінны сказаць: трацкізм ёсць зброя падпальшчыкаў вайны. Сказаць гэта цвёрдым голасам, бо мы гэта пазналі, мы гэта выпакутвалі, нам было нечувана цяжка ў гэтым прызнавацца, але гэта гістарычны факт, і за праўду гэтага факта мы заплацім галавой.

Вось усё, што мы, што я асабіста хацеў-бы сказаць, каб тая адказнасць, якую я буду несці, не была толькі фізічнай адказнасцю, а прынесла-б хоць-бы маленькую карысць.

Мы, і я ў тым ліку, не можам патрабаваць ніякай літасці, мы не маем на гэта ніякага права. Я скажу, што не трэба нам гэтай літасці. Мы даволі спетая кампанія паміж сабою, і калі Нікалай Іванавіч Муралаў, бліжэйшы чалавек Троцкага, аб якім я быў пераконан, што ён памрэ ў турме і не скажа ні аднаго слова, калі ён даваў свае паказанні і матываваў іх тым, што не хацеў памерці ў свядомасці, што яго імя можа быць сцягам для ўсякай контрреволюцыйнай сволачы, то гэта ёсць самы глыбокі рэзультат гэтага працэса.

Старшынствуючы: Перапынак на 20 мінут.

Апошняе слова падсуднага Сакольнікава

Я хачу скарыстаць свае апошняе слова не для таго, каб адкідаць ці абвяргаць якія-небудзь даныя следства ці вывады абвінаваўчага заключэння і дзяржаўнага абвінаваўцы. Я прызнаў сваю віну і свае злачынствы на папярэднім следстве, поўнасцю прызнаю іх тут і не маю да іх нічога дадаць. Я хацеў-бы толькі прасіць суд верыць мне ў тым сэнсе, што нічога мною не скрыта, што сказанае мною не поўтраўды, а сказана ўся праўда.

Наша праграма антыпартыйная, антысоцыялістычная. Тое, што тут гаварыў учора дзяржаўны абвінаваўца, гэта правільна. Аб гэтай праграме мы не маглі нікому сказаць, апрача сваіх бліжэйшых членаў цэнтра. Мы яе нават не адважваліся запісаць, не адважваліся яе распаўсюджваць, бо адно выкрыццё такой праграмы ўжо азначала-б банкрутства нашага блока.

Наша праграма была антынародная. Мы не маглі абаперціся на масы. Значыць, наступны крок быў той, што мы павінны былі пераходзіць да змоўніцкіх метадаў барацьбы. Апрача змовы, іншай зброі ў нас не аказалася ў руках. Ніякія магчымасці масавай барацьбы не былі для нас адкрыты. Але і для змовы-ж у нас сваіх уласных сродкаў не аказалася дастаткова, і мы павінны былі шукаць сілы, саюзнікаў па-за нашай арганізацыяй і па-за нашай краінай. Мы павінны былі шукаць любых саюзнікаў, якія нам падварачваліся, а падварачваліся нам злейшыя ворагі тых, з якімі мы пачалі барацьбу.

Так мы ад змовы перайшлі да авантур, і ад авантур неадкладна папалі ў фашысцкую воўчую яму.

Мы ўвабражалі, што зможам скарыстаць варожыя сілы, а на самой справе мы аказаліся зусім безданаможнай, прэзрэннай і падлейшай цацкай у іх руках. Але я павінен сказаць, што калі ўлетку 1932 г. я даваў сваю згоду на тое, каб увайсці членам у запасны цэнтр, я, вядома, не ўяўляў сабе ўсёй той карціны. Я сабе не ўяўляў і таго, што сілы нашы акажуцца так мізэрны і што гэта паўнейшая мізэрнасць нашых сіл прывядзе да бясслаўя, да ганебнага канца нашай палітыкі, знішчэння і падзення.

Я хацеў-бы сказаць яшчэ, грамадзяне суддзі, што будучы арыштован, будучы паведамлен аб тых даных, якія следства мела аб існаванні паралельнага цэнтра, я зразумеў, што наступіла паўнейшае пераражэнне блока. Што штурхнула мяне на тое, каб даць паказанні, прызнаць сваю віну? Я зразумеў, што наступіў канец дзейнасці блока, што спробы захавання нейкіх астаткаў гэтага блока могуць прывесці толькі да далейшага, яшчэ горшага згнівання і што трэба мець мужнасць прызнаць сваё пераражэнне і трымаць адказ за тое, што зрабіў. Я выказваю сваю надзею на тое, што не знойдзецца больш ні адной рукі ў совецкай краіне, якая-б папрабавала ўзняцца за дрэўка трацкісцкага сцяга. Я думаю, што і ў іншых краінах трацкізм выкрыт гэтым працэсам, сам Троцкі выкрыт, як саюзнік капіталізма, як падлейшы агент фашызма, як падпальшчык сусветнай вайны, якога ўсюды будуць ненавідзець і праследаваць мільёны.

Таму я думаю, што, паколькі трацкізм, як контрреволюцыйная палітычная сіла, канчаткова выкрыт, я думаю, што я і іншыя абвінавачваемыя могуць усё-ж прасіць вас, грамадзяне суддзі, аб літасці. Я зварачаюся з гэтай просьбай да суда і праз суд зварачаюся да ўсяго нашага народу, якому адкрыта прыношу сваю павінную.

Апошняе слова падсуднага Серэбракова

Я скарыстаў апошняе слова падсуднага не для абароны. Цалкам і поўнасцю я прызнаю справядлівасць таго, што ўчора грамадзянін пракурор гаварыў аб маіх найцяжэйшых злачынствах супроць радзімы, супроць краіны Совецтаў, супроць партыі. Цяжка ўсведамляць, што я, увайшоўшы з ранніх гадоў у рэвалюцыйны рух і прайшоўшы два дзесяткі год чэсным і адданым членам партыі, стаў у выніку ворагам народу і апынуўся тут, на лаве падсудных. Гэта адбылося таму, што ў свой час, зрабіўшы палітычную памылку і праявіўшы ўпартасць у ёй у далейшым, я ўсугубіў гэту памылку і яна, па немінучай логіцы лёсу, перарасла ў найцяжэйшыя злачынствы. Для мяне, вядома, гэта позняе пытанне. Але гэта можа быць урокам для ўсіх, хто да канца не ўсвядоміў, што ўпартасць у сваёй памылцы немінуча прыводзіць да таго, да чаго прывяла мяне.

Я даваў шчырыя паказанні на следстве і на судзе. Прашу суд паверыць у маю шчырасць і ў сваім рашэнні гэта ўлічыць.

ПРАЦЭС АНТЫСОВЕЦКАГА ТРАЦКІСЦКАГА ЦЭНТРА

Апошняе слова падсуднага Багуслаўскага

Я сёння стаю перад вамі, як дзяржаўны злачынца, здраднік, прадажнік.

Нельга не задаць сабе пытанне, як-жа гэта так здарылася? Я бачу некалькі прычын, якія лічу неабходным тут выказаць вам, грамадзяне суддзі. Я забыў тое, аб чым неаднаразова вучыў партыю Ленін, што адным аўтарытэтам, толькі адным словам верыць нельга. Вось гэта слепое давер'е да так званых аўтарытэтаў было прычынай майго не толькі глыбокага, але і канчатковага падзення.

Другая прычына — гэта зноў-такі забыцё аднаго з асноўных у партыйным будаўніцтве заветаў Леніна аб тым, што раз збіўшыся з дарогі, раз памыліўшыся, нельга праяўляць упартасць і настойваць на памылках, бо гэта можа прывесці, як і нас прывяло, у фашысцкае контррэволюцыйнае балота.

І, нарэшце, трэцяя прычына — гэта сістэма ашуканства, сістэма пастаяннага ашуканства. І я павінен сказаць, што ашуканства зусім не выяўляецца ў Троцкага і ў яго бліжэйшых саратнікаў толькі ў 1934 і 1935 годзе, калі скрылі так званыя дыверктывы. Калі аналізуеш увесь перыяд барацьбы, то бачыш, што ашуканства праводзілася вельмі часта. І гэта не выпадкова. Гэта сістэма, і я падкрэсліваю яшчэ раз сёння таму, што Троцкі яшчэ жыў, ён прадаўжае сёння ашукваць не толькі сваіх прыхільнікаў, але, на шчасце безрэзультатна, стараецца ашукваць і рабочых. І я лічу адной з прычын свайго глыбокага і канчатковага падзення вось гэту сістэму ашуканства. Я хачу перасперагчы кожнага, хто яшчэ не пераканаўся ў гэтым ашуканстве, што гэта сістэма з'яўляецца ракавой, як яна з'явілася ракавой і для мяне.

Грамадзяне суддзі, калі вы падыдзеце да пытання аб кары для мяне, я прашу вас улічыць, што не ўсе гады маёй работы напоўнены злачынным зместам. І гэта дае мне права прасіць вас аб літасці даць мне магчымасць любой работай, у любым месцы хоць колькі-небудзь загладзіць тыя злачынствы, якія я зрабіў перад краінай, перад рабочым класам.

Апошняе слова падсуднага Дробніса

Выхаваны і ўзгадаваны рабочым класам, я стаў супроць гэтага класа, як самы злейшы вораг і здраднік яго. Я награмаджаў адно злачынства за другім і расчышчаў шлях Троцкаму, які здраджваў і прадаваў оптам і ў розніцу соцыялістычную краіну, рабочы клас, фарсіруючы кровепралітную вайну.

Усё гэта здарылася таму, што я доўгія гады прадаўжаў жыць у затхлым, смуродным, смярдзючым, злавонным трацкісцкім падполлі.

Я дыхаў гэтым атручаным паветрам. Арышт і турма былі тым чысцілішчам, якое дало мне магчымасць канчаткова вынесці, выпатрашыць з сябе ўсю гэту гнусь. Я прашу мне верыць, што я ачысціўся і вымеў з усіх завулкаў сваёй свядомасці гнілы смярдзючы трацкізм, я бязлітасна з ім расправіўся.

Я стаў адвергнутым, праклятым сынам працоўных мас. Суд вынесе мне прыгавор. Які-б суровы ён ні быў, я яго прыму, як належнае і заслужанае. Але, калі, грамадзяне суддзі, у вас знойдзецца хоць малейшая магчымасць даць мне памерці не ганебнай смерцю, а вярнуць мяне ў рады таго класа, з якога я выйшаў, — я буду лічыць для сябе вялікім і свяшчэнным абавязкам гэты дар працоўнага народу апраўдаць поўнасцю, палкам.

Апошняе слова падсуднага Муралава

Учора дзяржаўны абвінаваўца ўсумніўся ў шчырасці нашых паказанняў. Я аднёс гэта і па свайму адрасу. Але я запэўняю суд, што ні на следстве, што ні тут на судзе ў сваіх паказаннях я нічога не ўтоіў, даў вычарпальныя весткі аб сваёй злачыннай дзейнасці і даў адпаведную ёй ацэнку. Я ўжо прышаміваў аб тым, як я прышоў да гэтага заключэння. Я доўга змагаўся з сабою, я ўспомніў выслоўе разумнейшага чалавека старажытнасці, жыўшага за сотні год да нашага часу, які сказаў: «Кожнаму чалавеку ўласціва памыляцца, але дурань той, хто не прызнае сваіх памылак», а я ладам — і злачынствы. Я не хацеў заставацца дурнем, я не хацеў заставацца злачынцам, бо калі-б я запіраўся, я быў-бы супраць для контррэволюцыйных элементаў, якія яшчэ ёсць, на жаль, на тэрыторыі совецкай рэспублікі. Я не хацеў быць карэннем, ад якога расці-б атрутныя парасткі, я не хацеў быць тым насеннем, ад якога расла-б нядобрая пшаніца, а атрутнае пустазелле. Вось што прымусіла мяне прызнаць усе мае злачынствы, і вось чаму я нічога не ўтойваю і не ўтойваю.

Было-б непрыстойна мне абвінавачваць каго-небудзь ва ўцягненні мяне ў трацкісцкую арганізацыю. Тым больш — к таму моманту, калі пачаўся трацкізм. У гэтым я не смею нікога абвінавачваць, у гэтым я сам віновен. Гэта мая віна, гэта мая бяда. Звыш 10 год я быў верным салдатам Троцкага, гэтага здрадніка рабочага руху, гэтага вартага ўсякага прэзрэння агента фашыстаў, ворага рабочага класа і Совецкага Саюза. Мае чыстасардэчныя паказанні я прашу ўлічыць пры вынясенні мне таго або іншага прыгавору.

Апошняе слова падсуднага Норкіна

На следстве я ўсё без утойвання расказаў аб сваіх злачынствах. Я раскаяўся. Усе мае паказанні зусім шчырыя і дакладныя. Гэтага дастаткова для таго, каб суд мог, разабраўшыся ва ўсіх дэталях і акалічнасцях, прыняць неабходнае рашэнне. Калі суд знойдзе, якія-небудзь акалічнасці дастатковымі для таго, каб змякчыць ацэнку і пакінуць мне жыццё, я заяўляю, што з найвялікшай прагнасцю я аддам свае сілы на барацьбу з фашызмам.

А на выпадак іншага рашэння, на выпадак, калі гэта маё слова на судзе — апошні акт майго жыцця, я хачу скарыстаць яго для таго, каб перадаць кіпучае маё прэзрэнне і нянавісць да Троцкага.

Апошняе слова падсуднага Шэстова

Грамадзяне суддзі, 13 год я быў членам контррэволюцыйнай трацкісцкай тэрарыстычнай, падрыўной і фашысцкай арганізацыі. Апошнія пяць год актыўна падрыхтоўваў і спрабаваў забіваць правадыроў працоўнага народу, правадыроў рабочага класа. Апошнія пяць год я актыўна вёў разбуральную падрыўную работу па шахтах і рудніках Кузнецкага басейна. Быў здраднікам, быў агентам самага рэакцыйнейшага атрада сусветнай буржуазіі—агентам нямецкага фашызма.

Незабітая яшчэ часцінка сумлення, якая захавалася, прымусіла мяне сказаць праўду, і я рашыў расказаць усё, што я ведаў, што я рабіў.

Я ведаў, на што ішоў. Я ведаў, куды я іду, ведаў, што мяне чакае, калі будзе правал арганізацыі, якой я кіраваў. Літасці не прашу. Літасці мне не трэба. Я хачу аднаго: змыць сваёю крывёю пляму здрадніка радзімы.

Апошняе слова падсуднага Страілава

Маімі асабістымі паказаннямі, а таксама тым вычарпальным аналізам, які ў маёй прамове зрабіў дзяржаўны абвінаваўца, поўнасцю паказаны і даказаны мае злачынствы і ўвесь цяжар маёй віны, для якіх няма апраўдання. Здрадзіўшы радзіме, я пакаціўся ўніз, зрабіўшыся агентам германскай разведкі і выконваючы яе агідныя заданні. Разам з гэтым, не будучы ніколі ў партыі, не будучы ніколі трацкістам, я зрабіўся і агентам трацкістаў. Я не буду пералічваць усіх маіх злачынстваў па шкодным рабоце. Яны вялікія і шырокія. Але я прашу суд пры вынясенні прыгавору ўлічыць, што калі я так нізка паў, здрадзіўшы радзіме, то гэта падзенне было не на радзіме, гэта падзенне было за граніцай — у выніку пэлага раду правакацый, слежак, шантажа і вымагання.

Я прашу таксама ўлічыць, што ніякіх адносін да тэрарыстычнай дзейнасці я ніколі не меў.

Я прашу суд з літасцю аднесціся да мяне, даць мне магчымасць творчай работай хоць-бы часткова загладзіць сваю найвялікшую віну перад пролетарскай дзяржавай.

ВЯЧЭРНЯЕ ПАСЯДЖЭННЕ 29 СТУДЗЕНЯ

Апошняе слова падсуднага Арнольда

Я ўжо гаварыў і яшчэ падкрэсліваю, што, маючы слабае, нізкае палітычнае развіццё, я быў нездольным разбірацца ў складаных пытаннях палітыкі, і ў выніку я апынуўся пад уплывам трацкістаў і аказаўся членам іх арганізацыі. Я прымаў удзел у злачынствах супроць перадавых кіраўнікоў партыі і ўрада, падняўшы на іх руку. І я вельмі рад, што гэта мне не ўдалося. Я ўсвядоміў сваё агіднае злачынства і стараўся акупіць работай свой ганебны паступак. На папярэднім следстве і тут на судзе я прызнаўся ва ўсім.

Грамадзяне суддзі, я — яшчэ не зусім згублены чалавек. Прашу захаваць мне жыццё, і я пастараюся яго апраўдаць не на словах, а на справе.

Апошняе слова падсуднага Ліўшыца

Абвінавачанне, прад'яўленае мне дзяржаўным абвінаваўцам, паглыбляецца яшчэ тым, што я з рабочых нізоў быў падняты партыяй да намесніка народнага камісара шляхоў зносін. Я быў акружаны давер'ем партыі. Я гэта давер'е растаптаў у контррэволюцыйным трацкісцкім балоце. Я не магу спасылацца на тое, што я не ведаў усёй праграмы Троцкага і цэнтра, хоць у сапраўднасці ўсёй праграмы я не ведаў. Факт застаецца фактам, што Троцкі з'яўляецца арганізатарам, натхніцелем аднаўлення капіталізма ў нашай краіне, а я ў гэтай подлай здрадніцкай рабоце яму дапамагаў.

Грамадзяне суддзі, я прашу ўлічыць, што жыццё маё напоўнена не толькі злачынствамі, я быў адданым партыі многа год, працаваў чэсна і аддана. Гэта дае мне права прасіць пролетарскі суд даць мне магчымасць чэснай работай акупіць свае страшэнныя злачынствы.

Апошняе слова падсуднага Князева

Учора я слухаў прамову дзяржаўнага абвінаваўцы з выключнай увагай і напружаннем.

Не гледзячы на тое, што яна была суровай, але я, чэсна кажучы, павінен прама і мужна сказаць, што яна была справядлівай. Я працаваў над падрыхтоўкай вайны, па-просту кажучы, над не прыбліжэннем для таго, каб расчысціць шлях да ўлады паганцу Троцкаму. За два з паловай гады я перажыў шмат цяжкіх мінут, але ад таго, што я пачуў на судзе, як наш цэнтр гандляваў оптам і ў розніцу тэрыторыяй Совецкага Саюза, у мяне валасы дыбам сталі.

Калі-б хто-небудзь з нас — работнікаў трацкісцкай перыферыі, верыўшых цэнтру, даведаліся аб гэтым, тут не месца для трагічных слоў, але я прама заяўляю, што ў гэтых «рэальных палітыкаў» перш-наперш не аказалася-б барады. Мабыць, мы разам-бы прышлі ў НКУС. Але цяпер нас прывялі.

Я шчыра заяўляю, што я да гэтага злачыннага гандлю дзяржавай непрычасны.

Грамадзянін дзяржаўны абвінаваўца зусім правільна сказаў, што ўся сіла нашай падрыўной, шкодніцкай, дыверсійнай работы канцэнтравалася на крушэннях. Чаму, паўстае пытанне? Крушэнні і аварыі на транспарце — гэта тое месца, дзе могуць шкоднікі, дыверсанты, класавыя ворагі беспакарана праводзіць сваю работу, будучы нявыкрытымі.

На гэтым працэсе, як і на папярэднім следстве, так і тут на судзе, я стараўся шчыра і да канца прызнаць усё без усякіх к таму прымусаў, з першага дня, як пачалося следства.

Я прашу грамадзян суддзяў гэту шчырасць маю ўлічыць.

Апошняе слова падсуднага Турока

Вельмі цяжка, вядома, прасіць у пролетарскага суда, а па сутнасці праз яго— у совецкага народу, мне, як здрадніку, як бандыту, літасці, але я павінен заявіць вам, што я не ўсё сваё жыццё вёў барацьбу з партыяй, а тым больш стаў на яўна контррэволюцыйны шлях.

З 20 год майго прабывання ў партыі я 14 год чэсна і аддана служыў справе рэволюцыі. Я не хачу сказаць, было-б страхотным думаць, што гэтыя мае заслугі ў мінулым у якой-бы там ні было меры перакрываюць тыя страшэнныя злачынствы, якія я зрабіў. Але гэтыя мае невялікія заслугі гавораць аб тым, што я ўсё-такі магу прасіць у вас літасці. Я даў самыя адкрытыя паказанні як аб сваёй дзейнасці, так і аб дзейнасці трацкісцкай арганізацыі. Я яшчэ раз прашу, калі магчыма, гэта ўлічыць.

Апошняе слова падсуднага Ратайчака

Цяжка гаварыць аб усіх злачынствах зробленых кожным з нас, удзельнікаў трацкісцкай контррэволюцыйнай арганізацыі. Звязаўшы свой лёс з гэтай контррэволюцыйнай арганізацыяй, я стаў агентам Троцкага, стаў агентам фашызма. Ужо ў 1935 годзе мне стала зусім ясна, што ўся гэта барацьба не ёсць барацьба за змену палітыкі партыі і ўрада, а гэта ёсць самая сапраўдная барацьба з усім рускім народам, які будуе сваё новае жыццё. Мы нашымі рукамі фактычна разбуралі тое, што стваралася часнымі будаўнікамі соцыялізма. Я ў 1935 годзе фактычна спыніў усякую актыўную работу ў гэтай контррэволюцыйнай арганізацыі. Я шукаў выхаду, каб самому адыйсці ад усякай сувязі з людзьмі, якія былі звязаны са мной і з якімі я быў звязан. Паўтараю, што гэтага мала. Да дня арышту я аб удзельніках сваёй арганізацыі і сваіх злачынствах не расказаў.

Грамадзяне суддзі, я — яшчэ не канчаткова згублены чалавек. Я яшчэ здолен да працы, і калі суд знойдзе магчымым захаваць маё жыццё, даць магчымасць чэснай працай акупіць віну перад совецкай краінай, я шчыра і чэсна заяўляю, што змагу чэснай працай у значнай меры сваю віну акупіць. Аб гэтым я і прашу суд.

Апошняе слова падсуднага Грашэ

Факты маёй злачыннай работы занадта яркі, і ўсякія спробы хоць-бы растлумачыць іх могуць, зразумела, толькі абцяжчыць маю долю. Я прашу суд паверыць мне, што я поўнасцю і палкам прызнаўся ў сваіх злачынствах перад прапоўнымі Совецкага Саюза, што я нічога не ўтоіў і не стараўся пераўменшыць сваёй віны.

Прашу суд улічыць гэта і даць мне магчымасць чэснай працай, хоць-бы часткова, змякчыць тую шкоду, якую я прынёс сваёй злачыннай дзейнасцю.

Апошняе слова падсуднага Пушына

Я не ўтоіў нічога ад суда, жадаючы ў сваім шчырым расказе даць выхад таму балючаму пачуццю маёй віны перад маёй радзімай, пачуццю, якое накаплівалася ва мне па меры таго, як я пачаў разумець сапраўдную сутнасць і мэты контррэволюцыйнай трацкісцкай арганізацыі, і якое вылілася ў чыстасардэчнае прызнанне.

І калі я зараз прашу суд аб літасці, то толькі для таго, каб, калі суд знойдзе магчымым захаваць мне жыццё, аддаць гэта жыццё на сумленнае служэнне на карысць маёй радзімы і мэйто народу.

* * *

У 19 гадзін 15 мінут суд ідзе на нараду.

У 3 гадзіны 30 студзеня старшынствуючы тав. Ульрых агалашае прыгавор.

ВОДГУКІ ЗА ГРАНІЦАЙ НА ПРАЦЭС АНТЫСОВЕЦКАГА ТРАЦКІСЦКАГА ЦЭНТРА

АНГЛІЯ

ЛОНДАН (сталіца Англіі), 28 студзеня. (БЕЛТА). «Дэйлі геральд» (орган профсаюзаў) публікуе заяву англійскага юрыста Коларда, які прысутнічае на працэсе антысовецкага трацкісцкага цэнтра. Колард указвае, што ён чакаў пяць дзён, раней чым выступіць з заявай, бо жадаў ўстанавіць пэўныя факты. Калі падсудных упершыню ўвялі ў залу суда, — указвае Колард, — ён адчуў да іх сім патыю. «Цяпер, — прадаўжае ён, — пасля таго, як я праслухаў на працягу чатырох дзён допыт падсудных, якія ўсе прызналі сябе вінаўнымі без агаворак, я магу сказаць без хістанняў, што я ўпэўнен у іх вінаўнасці. Я ніколі не чуў такога апавядання аб здрадах, забойствах, шпіянажы, шкодніцтве і тэроры, якое было расказана падсуднымі з поўнай бессардэчнасцю і бессаромнасцю.

Даючы характарыстыкі падсудных, Колард піша, што Пятакоў — гэта, яўна, главар, Радэк — пазёр, а Шэстоў — сапраўдны бандыт. Многія злачынствы, у якіх абвінавачваюцца падсудныя, у Англіі караліся-б смерцю. Вышынскі звяртаецца да падсудных са здзіўляючай стрыманасцю і далікатцвам.

ГЕРМАНІЯ

БЕРЛІН (сталіца Германіі), 28 студзеня. (БЕЛТА). Германскі друк абмяжоўвае сваю інфармацыю аб працэсе антысовецкага трацкісцкага цэнтра куцымі паведамленнямі германскага інфармацыйнага бюро. У гэтых старанна прэпараваных паведамленнях у скажоным выглядзе падаецца ход судовага следства.

Характэрна, што ўжо два дні «Дэйчэ альгемейнэ цэйтунг» не змяшчае больш паведамленняў свайго маскоўскага карэспандэнта, які прысутнічае на працэсе. Знікненне гэтых карэспандэнцый са старонак «Дэйчэ альгемейнэ цэйтунг» і абмежаванне ўсяго друку паведамленнямі германскага інфармацыйнага бюро, відаць, тлумачацца апасеннямі, як-бы ў друк не праскочылі якія-небудзь весткі аб працэсе, якія выкрываюць германскі фашызм.

ЗША

НЬЮ-ІОРК (буйнейшы цэнтр ЗША), 29 студзеня. (БЕЛТА). Найбольш уплывовая газета «Нью-Іорк таймс» змяшчае паведамленне свайго маскоўскага карэспандэнта, які піша, што на аднадушную думку замежных карэспандэнтаў і дыпламатаў, за выключэннем германскіх і японскіх, Вышынскі даказаў вінаўнасць падсудных. Ён рашуча абверг довады Радэка, Пятакова і кампаніі, прэтэндуючых на тое, што яны з'яўляюцца палітычнай партыяй. «Вышынскі, — адзначае карэспандэнт, — бліскуча вёў працэс. Немагчыма абвергнуць старанна сабраныя даныя, якія высунуты Вышынскім супроць падсудных». «Трацкісцкія змоўшчыкі, — гаворыцца далей у карэспандэнцыі, — вінаўны ў сур'ёзнейшым і паспяхова праводзіўшымся шпіянажы. Гэты шпіянаж праводзіўся ў шырокім маштабе людзьмі, якія займалі такія высокія пасады, што інфармацыя, якая знаходзілася ў іх распараджэнні, мела важнае значэнне для будучых ворагаў.

Да канца расследаваць злачынныя сувязі Бухарына, Рыкава, Угланава

(Рэзалюцыя рабочых завода «Шарикоподшипник» імя Кагановіча)

З пачуццём найглыбейшага абурэння даведаліся мы аб злачыннай сувязі правых — Бухарына, Рыкава, Угланава — з бандыцкай зграяй трацкістаў — Пятакова, Радэка, Сакольнікава, Серэбракова і інш.

Паводле прамых заданняў Троцкага, яны сумесна падрыхтоўвалі тэрарыстычныя акты супроць кіраўнікоў совецкага ўрада і вялікай комуністычнай партыі, яны ставілі сваёй мэтай адабраць у працоўных нашай краіны іх вялікія заваёвы.

Ніколі гэтаму не бывань! Усю кроў кроплю за кропляй мы аддамо за тое, каб алстаяць здабытае намі ва ўпартай барацьбе шчаслівае, радаснае жыццё.

Мы патрабуем, каб да канца былі расследаваны злачынныя сувязі Бухарына, Рыкава, Угланава і іншых з фашысцкім гадам Троцкім, і каб яны былі пасаджаны на лаву падсудных, як здраднікі радзімы.

Мы клянемся яшчэ шчыльней згуртаваць свае рады вакол ленінска-сталінскай партыі, ахоўваць, як сцяг на полі бою, жыццё нашага вялікага правадыра і настаўніка таварыша Сталіна і яго саратнікаў, і пад сцягам Сталінскай Канстытуцыі змагацца за канчатковую перамогу комунізма.

Смерць здраднікам і прадажнікам нашай радзімы!

Няхай жыве арганізатар перамог соцыялізма, родны правадыр і настаўнік— таварыш Сталін! (БЕЛТА).

БУХАРЫНА, РЫКАВА, УГЛАНАВА—НА ЛАВУ ПАДСУДНЫХ!

(Рэзалюцыя, прынятая на мітынгах рабочых, служачых і інжынерна-тэхнічных работнікаў менскага завода імя Кірава)

Пачуццё яшчэ большага гневу і нянавісці ахапіла нас усіх, калі мы даведаліся з ходу працэса над контррэволюцыйным пэнтрам трацкісцкіх бандытаў аб злодзействах правых адшчапенцаў, аб тым, што і правыя — Бухарын, Рыкаў, Угланаў — мелі свой падпольны контррэволюцыйны тэрарыстычны цэнтр.

Пацярпеўшы поўнае паражэнне ў барацьбе супроць партыі і вялікага совецкага народу, страціўшы ўсякую глебу пад нагамі, падлейшыя з подлых трацкісты, а разам з імі і двурушнікі, здраднікі — Бухарын, Рыкаў, Угланаў — ашуквалі партыю, вялі разам з трацкістамі бандытамі шпіёнскую і тэрарыстычную дзейнасць.

Яны збіраліся аднавіць капіталізм у нашай краіне, яны хацелі забіць нашых любімых правадыроў, нашага мудрага, дарагога правадыра таварыша Сталіна.

Мы патрабуем ад совецкага ўрада пасадзіць на лаву падсудных Бухарына, Рыкава, Угланава і інш. суўдзельнікаў у шпіянажы, тэроры і продажу нашай магутнай і шчаслівай радзімы. Патрабуем судзіць і іх па ўсёй строгасці рэволюцыйнага закона!

Няхай ведаюць усе ворагі, што ніхто не ў сілах спыніць пераможнае шэствіе соцыялізма. Совецкі народ адзінай сцяной стаіць на стражы заваёў вялікай Кастрычніцкай рэволюцыі.

Аб нашу сілу і вялікую адданасць большэвіцкай партыі разаб'юцца ўсе прошукі фашыстаў.

Яшчэ цясней згуртуем свае рады вакол партыі Леніна — Сталіна і любімага правадыра таварыша Сталіна.

МІРОН ЛЬВОВІЧ ПАЛУНОЎ

Не стала з намі баявога, слаўнага камандзіра-орденаносца, камандзіра-камісара 2-й стралковай дывізіі — камбрыга Мірона Львовіча Палунова.

Тав. Палуноў у лютаўскія дні 1917 года з'яўляецца актыўным членам Совета рабочых і салдацкіх дэпутатаў у г. Бахмуце, Екацерынаслаўскай губерні.

З лістапада 1917 года Мірон Львовіч у радах Чырвонай гвардыі Данбаса ўжо камандуе ротай. Грамадзянскую вайну т. Палуноў правёў на фронце, камандуючы ротай, батальёнам палком, быў ранен.

Яго самаадданая барацьба з ворагамі рэспублікі, яго геройскія подвігі адзначаны ўрадам. За баі на врангелеўскім фронце тав. Палуноў узнагароджан орденам Чырвонага сцяга.

З 1920 г. Мірон Львовіч член ВКП(б); ён увесь час шмат і настойліва вучыўся ваеннай справе, скончыў у 1919 годзе першыя маскоўскія камандныя пяхотныя курсы.

У 1924 годзе скончыў ваенную акадэмію імя Фрунзе. Заўсёды жыццерадасны, энергічны, клапатлівы, патрабавальны камандзір, бязмежна адданы партыі, радзіме — такім заўсёды ведалі байцы, камандзіры Мірона Львовіча Палунова.

Тав. Палуноў быў заўсёды ўзорам самаадданай работы, адданасці і любві да нашай радзімы, партыі Леніна—Сталіна, выхаваўшай яго як мужнага, смелага, храбрага камандзіра рабоча-сялянскай Чырвонай Арміі.

У соцыялістычным спабэрніцтве стралковых батальёнаў БВА, ініцыятарам і кіраўніком якога быў т. Палуноў, — 2-я Стралковая дывізія па праву заняла вядучае месца ў БВА.

Яго любілі, ён моцна згуртоўваў байцоў і камандзіраў. Усе свае веды, увесь свой вялікі камандны вопыт ён укладваў у справу ўмацавання баявой магутнасці дывізіі.

За поспехі ў справе баявой і палітычнай падрыхтоўкі Мірон Львовіч у 1936 годзе быў урадам узнагароджан орденам «Чырвонай звязды».

Спі, баявы друг і таварыш! Справа, за якую ты аддаў усё сваё жыццё, непераможна. У барацьбе з ворагамі 2-я Беларуская Стралковая дывізія горда і высока панясе свае баявыя сцягі, беражна захоўваючы памяць аб сваім слаўным баявым камандзіру.

Варашылаў, Убарэвіч, Булін, Мулін, Апанасенка, Шэвалдзін, Чэрнабруўкін, Коўцюх, Пісманік, Таруцінскі, Баброў, Карпушын, Нікіцін, Гарнастаеў, Шах-Назараў, Бальчэнка, Зюзь-Якавенка, Храменка, Сазонтаў, Красноў, Гарачоў, Крэпачоў, Сердзіч, Юнг, Казанскі, Зельдовіч, Подлас, Сычоў, Пога, Ермольчык, Грыбаў, Гарбачоў, Сураўцэў, Арман, Дракахруст.

ПАМЯЦІ БАЯВОГА ТАВАРЫША

Ніяк нельга мірыцца з думкай, што ўшоў ад нас большэвік, баявы камандзір, выдатны друг і таварыш Мірон Львовіч Палуноў.

Нечакана абарвалася вялікае, творчае жыццё, якое ён прысвяціў і аддаў справе партыі Леніна — Сталіна.

Жыццёвы шлях Мірона Львовіча — яркі ўзор для нас, камандзіраў, палітработнікаў, байцоў па сумеснай рабоце.

У 1917 годзе тав. Палуноў арганізуе чырвонагвардзейскія атрады з шахцёраў Юзаўкі. З лістапада 1917 года з рабочымі Данбаса, камандуючы ротай у чырвонагвардзейскім атрадзе, тав. Палуноў змагаецца з белаказачымі бандамі Каледзіна. У 1918-19 гг. тав. Палуноў на пасадзе камбата, кампалка, начальніка штаба дывізіі зраджаецца супроць белагвардзейскай зграі на Паўднёвым фронце, а ў 1920 годзе — з бандамі Махно, а потым прымае ўдзел у разгроме апошняга аплоту контррэволюцыі на поўдні — Врангеля.

Грамадзянская вайна закончана, і Мірон Львовіч, не гледзячы на расхістанае сваё здароўе (т. Палуноў у часе грамадзянскай вайны чатыры разы цяжка ранен і пяжка кантужан), імкнецца на вучобу ў Ваенную акадэмію. У 1924 годзе, скончыўшы Ваенную акадэмію, Мірон Львовіч з вялікім баявым вопытам і высокай тэарэтычнай падрыхтоўкай зноў на камандных пасадах аддае ўсю сваю энергію, веды, волю і баявы вопыт на ўмацаванне РСЧА.

Будучы камандзірам дывізіі, ён увесь аддаецца баявому выхаванню байцоў і камандзіраў. І недарма 2-я Беларуская пад яго кіраўніцтвам — адна з перадавых дывізій акругі.

За дзве гадзіны да смерці ён рыхтаваў даклад для начальніцкага складу з гісторыі вайны. Сваёй рабоце Мірон Львовіч заўсёды аддаваўся поўнасцю і да канца, не лічачыся ні з часам, ні са станам здароўя.

Ён вучыў кадры паказам, сваёй работай і ўзорнымі адносінамі да справы. Мірон Львовіч чула адносіўся да запатрабаванняў байцоў і камандзіраў. У любы час кожны з нас атрымліваў ад яго павучальную, падбадзёрваючую параду, дапамогу ў рабоце.

Абарвалася жыццё выдатнага баявога, двойчы ордэнаноснага камбрыга тав. Палунова, адданага члена большэвіцкай партыі Леніна — Сталіна, баявога сына соцыялістычнай радзімы.

Бывай, баявы таварыш і друг Мірон Львовіч!

Мы прыкладзем усе сілы і энергію да яшчэ большага ўмацавання баявой магутнасці дывізіі.

Вышэй баявыя сцягі дывізіі!

Ерэмін, Лунін, Шэрстнёў, Загароўскі, Біруля, Акімаў, Саракош, Ліксонаў, Казлоў, Сімуцін, Раманаў, Чэглакоў, Карбуноў, Антонаў, Адамовіч, Несцераў, Прахін, Аменеў, Радзіонаў, Аўдзейчык, Манакаў, Мягкоў, Новікаў, Раманенка, Вінаградаў.

Прэзідыум менскага гарадскога совета з глыбокім жалем паведамляе аб заўчаснай смерці камандзіра-камісара дывізіі, чырвонасцяжніка

МІРОНА ЛЬВОВІЧА ПАЛУНОВА

і выказвае глыбокае спачуванне яго мацеры і брату.

ПРЭЗІДЫУМ ГОРСОВЕТА.

БЕЛАРУСКІ НАРОД ГОРАЧА ВІТАЕ ПРЫГАВОР СУДА

НА ЗДЫМКУ: мітынг калектыва яўрэйскага дзяржаўнага тэатра з поваду працэса. Выступае народны артыст рэспублікі т. Рафальскі. Фото Лупенка (БСФ).

АДАБРАЕМ СПРАВЯДЛІВЫ ПРЫГАВОР

Сёння ў 6 гадзін раніцы на варштатабудаўнічым заводзе імя Кірава адбыліся па цэхах лятучыя мітынгі рабочых па поваду вынесенага Ваеннай калегіяй прыгавору па справе антысовецкага трацкісцкага цэнтра. Усе як адзін рабочыя адабраюць вынесены прыгавор. Рабочы новамеханічнага цэха тав. Губіч у сваім выступленні сказаў:

— Мы цалкам адабраем прыгавор Ваеннай калегіі Вярхоўнага суда СССР. Прыгавор суда—гэта прыгавор усяго совецкага народу над тройчы праклятымі трацкістамі. Мы, рабочыя, яшчэ больш узнімем нашу класавую пільнасць, яшчэ больш павысім прадукцыйнасць працы.

Рабочы гэтага-ж цэха тав. Віслаух заявіў:

—Трэба канчаткова ачысціць совецкую зямлю ад ворагаў народу, ачысціць ад усіх тых, хто шкодзіць нашаму сацыялістычнаму будаўніцтву і імкнецца на забойства нашых дарагіх правадыроў. Мы просім совецкі суд прыцягнуць да адказнасці Бухарына і Рыкава, якія самкнуліся з контрэволюцыйным трацкізмам.

Цэлы рад рабочых выступала на мітынгу і ў кавальскім цэху. Адзначаючы ўсю шкодніцкую дзейнасць трацкісцкіх бандытаў, рабочыя аднадушна адобрылі прыгавор суда.

Рабочы кавальскага цэха тав. Безюк сказаў:

— Я не магу спакойна гаварыць аб гэтых гадах, якія відалі пад адкос нашы паязды з людзьмі. Рабочы нашага завода тав. Шылькрод, які ехаў у Чырвоную Армію, таксама застаўся калекай у часе крушэння поезда.

У прынятай на мітынгу рэзалюцыі гаворыцца: «Наш совецкі суд вынес зусім справядлівае рашэнне. Мы абавязваемся яшчэ больш узняць нашу рэволюцыйную пільнасць, павысіць работу па вытворчасці, яшчэ больш узняць абаронную работу.

Няхай жыве наша квітнеючая радзіма!

Няхай жыве наш родны і дарагі правадыр і настаўнік таварыш **Сталін!**

СЕМАШКА.

НАША ВОЛЯ ВЫКАНАНА

Тысячны мітынг на фабрыцы «Кастрычнік»

Рабочыя і работніцы чырвонасцяжнай фабрыкі «Кастрычнік» раніцой 30 студзеня сабраліся на мітынг. Няма меж іх нянавісці да тройчы праклятых мярзотнікаў трацкістаў — гэтых наймітаў германскага фашызма і японскай ваеншчыны. З выключным аднадушшам, бурай апладысментаў і гарачымі авацыямі ў гонар нашага роднага любімага Сталіна сустрэлі рабочыя і работніцы прыгавор Ваеннай калегіі Вярхоўнага суда па справе трацкісцкага антысовецкага цэнтра.

Магутна, усе, як адзін, са шчырай адданасцю і любоўю да партыі Леніна—Сталіна, да совецкага ўрада ўстаюць рабочыя і работніцы і доўга апладзіруюць, калі сакратар парткома тав. Канопік заканчвае сваю інфармацыю словамі: «Няхай жыве наш родны любімы Сталін!».

Работніца Гурановіч выказвае ад імя старых рабочых сваю радасць за справядлівы прыгавор совецкага суда, які рашуча і раз назаўсёды знішчае з твару зямлі бандытаў з вялікай дарогі.

Маладая работніца тав. Еўмененка ад імя ўсёй моладзі выказвае аднадушнае адабрэнне рашэння суда, заклікае моладзь вучыцца пазнаваць класавага ворага, ударна працаваць, каб быць дастойнымі вялікай партыі Леніна — Сталіна.

З яркімі і поўнымі нянавісці да ворагаў народу прамовамі выступілі работніцы тт. Ганцук і Зялёнка.

Тысячны мітынг рабочых фабрыкі прыняў аднагалосна рэзалюцыю, у якой вітае прыгавор Вярхоўнага суда Саюза ССР. «Усякі хто наімкнецца падняць руку на нашу краіну, на нашых правадыроў, на наша жыццё, — гаворыцца ў прынятай рэзалюцыі, — захлынецца ў сваёй уласнай крыві. Наш гераічны рабочы клас, выхаваны вялікай партыяй Леніна—Сталіна, нашым дарагім Сталіным, умее заўсёды і ўсюды перамагаць ворагаў, ён шырока і бязмежна любіць сваю радзіму і сваіх правадыроў».

П. КАВАЛЁЎ.

ВІТАЕМ ПРЫГАВОР ПРОЛЕТАРСКАГА СУДА

Вестка аб вынясенні прыгавору пролетарскага суда над гнуснай контррэволюцыйнай трацкісцкай бандай абляцела ўсе цэхі фабрыкі «Комунарка» (Менск). Работніцы начных змен паспешна збіраліся на мітынг, каб выказаць сваё адабрэнне прыгавору над ворагамі народу.

Сакратар парткома тав. Рабкін паведамляе аб прыгаворы Ваеннай калегіі Вярхоўнага суда Саюза ССР над трацкістскімі выралкамі, дыверсантамі і шпіёнамі.

— Прыгавор суда — наш прыгавор Мы адабраем прыгавор нашага пролетарскага суда, які выканаў волю ўсяго працоўнага народу Совецкага Саюза, — сказала стаханаўка фабрыкі тав. Куфель.— Мы ніколі і нікому не дазім ганьбіць нашай радзімай, кроўю нашага народу. Крывавыя гаўляры атрымалі суровую кару.

Майстар цэха Яшкевіч у сваім выступленні сказаў:

— Калі я слухаў па радыё абвінавачую прамову тав. Вышынскага, я разам з пракурорам абвінавачваў подлых фашысцкіх сабак. Іх абвінавачваў увесь народ. Прыгавор суда — прыгавор усяго народу.

Усе рабочыя і работніцы фабрыкі вітаюць прыгавор пролетарскага суда над азвярэлай бандай трацкістаў — агентаў міжнароднага фашызма. Выступіўшыя работніцы і рабочыя выказалі сваё адабрэнне прыгавору.

У рэзалюцыі яны пішуць: «Смерць ворагам народу! Смерць шалёным фашысцкім сабакам!

Мы будзем жорстка караць усіх ворагаў народу, якія паспрабуюць пашкодзіць нашаму сацыялістычнаму будаўніцтву, нашай квітнеючай шчаслівай радзіме, якія паспрабуюць падняць руку на нашых родных і любімых правадыроў.

Яшчэ з большай энергіяй возьмемся за работу, за выкананне промфінплана, за ўмацаванне абароназдольнасці нашай краіны. Павысім рэволюцыйную пільнасць на кожным участку.

Нашы сэрцы, нашы лепшыя пачуцці накіраваны да нашага дарагога і мудрага правадыра таварыша **Сталіна.** Акружым сяной нашых родных кіраўнікоў партыі і ўрада.

Няхай жыве любімы і родны бацька таварыш **Сталін!**

А. ЛОСЬ.

ЯШЧЭ ВЫШЭЙ РЭВОЛЮЦЫЙНУЮ ПІЛЬНАСЦЬ!

Рабочыя і работніцы начной змены хлебазавода хутка сабраліся на мітынг. Аднадушнымі воклічамі адабрэння і апладысментамі сустрэлі прыгавор Ваеннай калегіі Вярхоўнага суда СССР.

— Гэтыя фашысцкія бандыты жадалі аднавіць капіталізм і знішчыць наша шчаслівае красачнае жыццё, адняць у нас любімых правадыроў. Яны, гэтыя бандыты, руйнавалі, прадавалі па кавалках нашу радзіму, гатовы былі на ўсё абы звергнуць ім ненавісны лад сацыялізма, — гаворыць тав. Рачко, майстар печы. Але яны пралічыліся. Няхай ведаюць фашысты, што няма той сілы, якая-б магла перашкодзіць нам будаваць ваша шчаслівае, заможнае жыццё.

Прыгавор Вярхоўнага суда — гэта наш прыгавор. Мы заяўляем нашай любімай партыі Леніна — Сталіна, нашаму бацьку і другу таварышу **Сталіну** і совецкаму ўраду, што ў любую мінуту мы гатовы грудзьмі стаць на абарону вялікага Совецкага Саюза.

З вялікім гневам і нянавісцю да ворагаў народу, да фашысцкіх бандытаў — Пятакова, Серэбракова, Мураліва, Лўшыпа і ім падобных, якія забілі і пакалечылі шмат чэсных і адданых сыноў вялікай радзімы сацыялізма — былі прасякнуты прамовы рабочых Шэлімава, Грабоўскага, Сукалава і іншых.

У аднагалосна прынятай рэзалюцыі рабочыя і работніцы начной змены хлебазавода горача і аднадушна вітаюць прыгавор Ваеннай калегіі Вярхоўнага суда СССР.

У прынятай рэзалюцыі яны абавязаліся яшчэ вышэй узняць рэволюцыйную пільнасць, каб выкрыць і знішчыць астаткі трацкістска-зіноўеўскіх бандытаў, яшчэ цясней згуртавацца вакол партыі і ўрада і любімага правадыра таварыша **Сталіна.**

У сваёй рэзалюцыі яны выносяць рабочае дзякуй слаўным чэкістам і генеральнаму камісару дзяржаўнай бяспекі тав. Ежову, якія выкрылі і выкрываюць подлых здраднікаў радзіме.

РОБЕРМАН.

ВАЕННА-ФАШЫСЦКІ МЯЦЕЖ У ІСПАНІІ

Рэспубліканцы занялі Заходні парк

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 28 студзеня. (БЕЛТА). Паводле паведамлення агенцтва Гавас з Мадрыда, старшыня камітэта абароны Мадрыда генерал Міяха зрабіў наступную заяву: «На працягу папярэдняй ночы нашы войскі ў выніку некалькіх рукапашных схватак з працаўнікам занялі амаль поўнасцю Заходні парк» (на захадзе ад Мадрыда).

***

ПАРЫЖ, 29 студзеня. (БЕЛТА). У сённішнім паведамленні камітэта абароны Мадрыда гаворыцца, што ў часе аперацыі ўрадавых войск у сектары Монклоа (на захадзе ад Мадрыда) мяцежнікі былі адкінуты да граніцы Заходняга парка. Рэспубліканцы пагражаюць комунікацыям мяцежнікаў, якія вядуць да Універсітэцкага гарадка.

У сектары Аранхуэс (на поўдні ад Мадрыда) новая атака германскіх часцей была энергічна адбіта.

***

БАРСЕЛОНА (сталіца Каталонскай аўтаномнай вобласці), 29 студзеня. (БЕЛТА). Агенцтва Фабра паведамляе, што рэспубліканскія войскі ў выніку смелай аперацыі поўнасцю занялі Заходні парк.

Упартыя баі ў раёне Эль Пардо

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 28 студзеня. (БЕЛТА). Згодна паведамлення мадрыдскага карэспандэнта агенцтва Гавас, учора ў раёне Эль Пардо, на захад ад Мадрыда, увесь дзень назіраўся націск з боку мяцежнікаў. Скапленне войск мяцежнікаў у гэтым раёне заўважалася на працягу ўсіх апошніх дзён. і ў сувязі з гэтым урадавымі войскамі былі прадпрынятыя меры перасцярогі.

Эскадрылля імя „Комсомола"

ВАЛЕНСІЯ (горад на ўсходнім узбярэжжы Іспаніі, часовая рэзіденцыя ўрада), 28 студзеня. (БЕЛТА). Па халайніцтву экіпажа першай эскадрыллі 12-й групы іспанскага паветранага флота міністр морскага флота і авіяцыі пастанавіў прысвоіць гэтай эскадрыллі назву «Комсомол» у гонар гераічнага экіпажа совецкага цеплахода, патопленага мяцежнікамі.

Сабатаж справы неўмяшання

ЛОНДАН (сталіца Англіі), 29 студзеня. (БЕЛТА). Учора адбылося пасяджэнне падкамісіі міжнароднага камітэта па неўмяшанню ў іспанскія справы. Быў разгледжан выпрацаваны экспертамі план кантролю на сушы і на моры пад захаваннем пагаднення аб неўмяшанні.

Партугальскі дэлегат выступіў ад імя Германіі, Італіі і Партугаліі, і з яго слоў было відаць, што гэтыя тры дзяржавы маюць намер усімі магчымымі шляхам сарваць ажыццяўленне плана. Партугальскі дэлегат нават назваў план «фарсам», але дадаў, што гэта яго асабістая думка. Падкамісія прыняла рашэнне запытаць урады аб іх адносінах да плана кантролю.

Зладзействы трацкісцкіх бандытаў

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 29 студзеня. (БЕЛТА). Вакол забойства Навашына (гл. «Звязду» ад 28 студзеня) цыркулююць рознастайныя чуткі, якія падхватваюцца і распаўсюджваюцца французскім друкам.

Мае пэўную цікавасць сённішняе паведамленне лонданскага карэспандэнта газеты «Эко дэ Пары» (орган генштаба), якое звязвае забойства Навашына з таямнічай смерцю нейкага англічаніна Юза Фаранда Ліч, якая адбылася тыдзень—два таму назад у Монтэ-Карло (княжства Манако). Паводле слоў карэспандэнта, Ліч падтрымліваў самую цесную сувязь з Навашыным. Ліч знаходзіўся на англійскай сакрэтнай службе і асабліва цікавіўся дзейнасцю трацкістаў. Да вайны Ліч бываў у фінансавых колах Пенербурга, выконваў сакрэтныя даручэнні англійскага пасольства, а ў далейшым служыў афіцэрам сувязі паміж саюзнікамі і арміямі Калчака і Дзенікіна. Гэта паведамленне лонданскага карэспандэнта крымушае дапусціць, што і Навашын і Ліч, як відаць, сталі афярамі трацкістаў.

Францыя мацуе сваю абарону

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 28 студзеня. (БЕЛТА). Сёння ў палаце дэпутатаў адбыліся спрэчкі па пытанню аб нацыянальнай абароне. Дэпутат Богіт узняў пытанне аб тэмпах перакідкі французскай арміі да граніц, заявіўшы, што на перакідку арміі да граніц у выпадку нападу на Францыю патрэбна будзе 18 гадзін, у той час, як германскія арміі могуць быць перакінуты ў 4 гадзіны.

Ваенны міністр Даладзе, адказваючы на запытанне дэпутата Шандалена аб становішчы «лініі Мажыно» (лініі ўмацаванняў на ўсходняй граніцы Францыі), заявіў:

«На працягу некалькіх тыдняў будуць закончаны ўсе неабходныя пабудовы, і з гэтага часу «лінія Мажыно» ў поўнай меры здольна аказаць супраціўленне нечаканай атацы праціўніка».

УРАДАВЫ КРЫЗІС У ЯПОНІІ

ТОКІО (сталіца Японіі), 29 студзеня (БЕЛТА). Угакі сёння раніцой афіцыяльна паведаміў японскага імператара аб адмаўленні ад фармавання ўрада. Адмаўленню папярэднічала сёння раніцой заява ближэйшых прыхільнікаў Угакі аб тым, што ён «адмаўляецца ад ваеннага звання» і надалей будзе толькі «звычайным цывільным чалавекам». (Угакі — адстаўны генерал). Пры гэтым, паводле слоў газет, выпусціўшых з гэтай прычыны экстранага выпуску, Угакі будзе прадаўжаць спробы сфармаваць габінет у якасці «простага палітычнага дзеяча».

Ад Сталінскага горрайкома КП(б)Б

Тт. Савоніе Д. С. і Уладзікоўскі С. І. выклікаюцца ў Сталінскі горрайком КП(б)Б.

Асоб, якія ведаюць аб іх месцазнаходжанні, просьба паведаміць у Сталінскі горрайком КП(б)Б.

Адказны рэдактар Д. В. ЮРКОЎ.

СЁННЯ Ў ТЭАТРАХ І КІНО

БЕЛАРУСКІ ПЕРШЫ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР (БЛТ-1)
30 студзеня Абан. № 27
ВАЎКІ І АВЕЧКІ

ДЗЯРЖ. ЯЎРЭЙСКІ ТЭАТР БССР
30 студзеня Абан. № 60
З А К А Т

Гукавы кінотэатр «Чырвоная ворка»
САЛАВЕЙ-САЛОВУШКА

Гукавы кінотэатр «Інтэрнацыянал»
ШЛЯХ КАРАБЛЯ

Дзіцячы гукавы кінотэатр
КАНЦЭРТ БЕТХОВЕНА

Гукавы кінотэатр «Пролетарый»
«БЕСПРЫДАННІЦА»

Гукавы кінотэатр «Спартак»
ЗЛАТЫЯ ГОРЫ

Марыпагорскаму сельскагаспадарчаму тэхнікуму
ПАТРЭБНЫ ВЫКЛАДЧЫКІ
па беларускай мове і літаратуры, рускай мове і літаратуры і сацыяльна-эканамічнаму цыклу.
Зварачацца па адрасу: БССР, п/а Марына-Горка, Пухавіцкага раёна, сельскагаспадарчаму тэхнікуму. Комунальна-бытавыя паслугі бясплатна, Аплата падёмных, праезду згодна існуючага заканапалажэння.

Фабрыцы «Палесдрук» (Гомель, Совецкая, 1)
ПАТРАБУЮЦЦА
кваліфікаваныя
ЛІНОЎШЧЫКІ.
Пакоем забяспечваем.

27 студзеня ў сталовай інваліднай арцелі па Комсамольскай вул. астаўлен партфель з матэрыяламі па гадавой справаздачы Чэрвеньскага Хімлесгаса. Знайшоўшага партфель прашу за ўзнагароду звярнуць па адрасу: Менск, Комсамольская вул. № 31/33, кв. 34. Сукоўскаму П. Е.

БЕЛКАНТОРА АКЦЫЯНЕРНАГА ТАВАРЫСТВА КРЭДЫТ-БЮРО
РАСШУКВАЕ:
НАСЛЕДНІКАЎ ПА НАСТУПНЫХ СПРАВАХ АБ СПАДЧЫНЕ ЗА МЯЖОЙ НА БУЙНЫЯ СУМЫ:
1. ФЕРХ Марыю і Анну. Наследадаўца ФЕРХ, памёр у Швейцарыі.
2. ЗАРСКІЯ, яны-ж ЦАРСКІЯ, або ЖАРСКІЯ — дзеці памёршых бацькоў Петра і Елізаветы пасля наследадаўца Васілія ЗАРСКАГА (Царскага), памёршага ў Амерыцы.
3. Жонка і дзеці (у тым ліку дачка па імені Валенціна) пасля памёршага ў Амерыцы НЕСЦЯРОВІЧА Антона.
4. Раіна КРЭЧКО — удава памёршага ў Амерыцы Васілія КРЭЧКО.
5. ДУДКОЎСКІЯ Екацерына і ВІТОЛЬД пасля памёршага ў Амерыцы Вінцэнта або Вікенція ДУДКОЎСКАГА.
6. САМОЧЭНКА Тімафей пасля памёршага ў Амерыцы брата Джона (Івана) САМОЧЭНКА.
7. Удава і двое дзяцей (імёны не ўказаны) пасля памёршага ў Амерыцы СЕДЛІСТРОВІЧА Сцяпана.
8. БЕЧЫНКОЎ Аляксандр Іванавіч, а ў выпадку яго смерці яго наследнікі (жонка, дзеці, бацькі).
АДРАС Белканторы Акцыянернага таварыства Крэдыт-Бюро: г. Менск, рог Совецкай і Ленінскай, памяшканне Дзяржбанка.

ДАВОДЗІЦЦА ДА ВЕДАМА ЎСІХ ПЕРСАНАЛЬНЫХ ПЕНСІЯНЕРАЎ БССР (рэспубліканскага значэння), што пры атрыманні персанальнай пенсіі за студзень 1937 г.
неабходна абавязкова ПРАДСТАВІЦЬ АШЧАДКАСЕ,
у якой атрымлівае пенсію, наступныя дакументы: а) даведку аб месцы працы з паказаннем атрымліваемага заробку, а калі не працуе — даведку ад жакта; б) даведку аб сямейным становішчы з паказаннем узросту, членаў сям'і, в) прад'явіць пашпарт.
Пры атрыманні персанальнай пенсіі па даверанасці неабходна даверанай асобе прад'явіць пашпарт (апрача вышэйпералічаных дакументаў) і прадставіць даведку жакта або міліцыі па якой прычыне сам персанальны пенсіянер не можа з'явіцца за атрыманнем персанальнай пенсіі.
НАРКАМСОБЕС БССР.

МЕНГАРКОМГАС
даводзіць да ведама грамадзян г. Менска,
што на падставе абавязковай па становы менгорсовета ад 20 студзеня 1937 г.,
з 1 лютага будзе прыступлена
да лоўлі незарэгістраваных брадзячых сабак,
з'яўляючыхся на вуліцах горада без наморднікаў і нумароў.
Рэгістрацыя сабак і выдача нумароў праводзіцца ў Менгаркомгасе (плян Волі № 2) штодзённа з 9 да 16 гадзін. апрача агульных выхадных дзён.
Злоўленыя сабакі будуць трымацца ў ізалятары аддзела ачысткі (магілёўскі тракт, уроч. 3 карчмы) на працягу 3 дзён. Пасля гэтага тэрміна незабраныя ўласнікамі сабакі будуць знішчаны.
Пры звароце сабак уласнікам ад дзел ачысткі спагнане каштоўнасць утрымання сабакі ў ізалятары
МЕНГАРКОМГАС.

Інстытут масавага завочнага навучання партактыва пры ЦК КП(б)Б
паведамляе, што 31 СТУДЗЕНЯ, у 18 гадзін 30 мінут, праз радыёстанцыю імя Комінтэрна будзе перадавацца
ДАКЛАД тав. БУБНОВА
на тэму:
«СОВЕЦКАЯ КАНСТЫТУЦЫЯ І ПРАВА НА АСВЕТУ».
Слухайце арганізавана ў радыёаўдыторыях. партгабінетах і індывідуальна на даму.
ДЫРЭКТАР ІМЗО пры ЦК КП(б)Б
БЕКЕРМАН.

ПАСТАНОВА № 19
ПРЭЗІДЫУМА МЕНСКАГА ГАРАДСКОГА СОВЕТА
ад 11 студзеня 1937 г.
Аб заметцы ў газеце «Правда» пад назвай «Прыемный день в горсовете», змешчанай 9 студзеня 1937 г.
1. Адзначыць, што заметка ў газеце «Правда» зусім правільна асвятляе недахопы пастаноўкі прыёму наведвальнікаў па менскаму горсовету.
2. Лічыць недапушчальным з боку работнікаў Гарана і ахматылда парушэнне ўстаноўленых дзён і гадзін прыёму і папярэдзіць кіраўнікоў гэтых аддзелаў, што за парушэнне ў далейшым прыёму наведвальнікаў, яны будуць прыцягнуты да суровай адказнасці.
3. Лічыць недастатковымі прыёмныя гадзіны загадчыкамі аддзелаў і нам. старшыні горсовета, якія прымаюць па дзве гадзіны, і павялічыць колькасць гадзін прыёму загадчыкамі аддзелаў і іх намеснікамі (па чарзе праз дзень) з 10 да 1 гадзіны дня.
4. У абавязковым парадку ўвесці дзяжурствы членаў прэзідыума, якія працуюць непасрэдна ў апараце горсовета, у выхадныя дні з 9 да 4 гадзін дня.
Тав. Казлоўскаму ўстанавіць графік дзяжурстваў.
5. У абавязковым парадку захоўваць дні і гадзіны вячэрняга прыёму — з 7 да 9 гадзін — як загадчыкамі аддзелаў, так і іх намеснікамі, аб чым давесці да ведама насельніцтва.
6. Устанавіць для жылземкіраўніцтва, горжылсаюза і кіраўніцтва добрабыту прыёмныя гадзіны начальнікаў аддзелаў і іх намеснікаў у адпаведнасці з гадзінамі прыёму членаў прэзідыума горсовета.
7. Прапанаваць т. Курапата (горжылсаюз) неадкладна распрацаваць прыёмныя гадзіны старшынь жакта, аб чым давесці да ведама насельніцтва.
8. Устанавіць у прыёмнай горсовета штовячэрняе дзяжурства работнікаў апарата горсовета і яго аддзелаў з 4 да 10 гадзін вечара.
Тав. Казлоўскаму ўстанавіць графік дзяжурстваў па ўзгадненню з загадчыкамі аддзелаў.
9. Прапанаваць усім загадчыкам аддзелаў устанавіць гадзіны прыёму з 10 да 1 гадзіны дня для тых работнікаў, якія звязаны з уходам з установы па ўрочны час.
10. Гэту пастанову апублікаваць у друку.
Нам. старшыні менскага горсовета В. ДРАБЫШЭЎСКІ.
Сакратар менгорсовета І. КАЗЛОЎСКІ.

У аддзел аб'яў званіце па тэл. 21-845

ІНСТЫТУТ МАСАВАГА ЗАВОЧНАГА НАВУЧАННЯ ПАРТАКТЫВА пры ЦК КП(б)Б
СЛУХАЙЦЕ РАДЫЁЛЕКЦЫІ З АВОЧНАЙ ПАРТВУЧОВЫ Ў ЛЮТЫМ 1937 г.
ПРАЗ МЕНСКУЮ РАДЫЁСТАНЦЫЮ РВ-10
ЧАС ПЕРАДАЧЫ: штодзённа (апрача 6, 12, 18, 24, 30) з 19 г. 30 м. да 20 г. 45 м. па наступных чыслах: 1, 3, 10, 11, 13, 14, 15, 16, 17, 19, 20, 21, 23, 26, 27, 28.
З 19 г. 30 м. да 20 г. 30 м. па наступных чыслах: 2, 4, 5, 7, 8, 9, 22, 25.
Курс гісторыі ВКП(б) на павышаным узроўні перадаецца днём з 13 г. 00 м. да 14 г. 15 м.
ГІСТОРЫЯ ВКП(б)
Папулярны курс
3/II—Партыя большэвікоў у гады імперыялістычнай вайны.
13/II—Як большэвікі арганізавалі перамогу лютаўскай буржуазна-дэмакратычнай рэволюцыі.
23/II—Як большэвікі арганізавалі перамогу вялікай пролетарскай рэволюцыі (1-я лекцыя).
ГІСТОРЫЯ ВКП(б)
Павышаны курс
Час перадачы з 19 г. 30 м. да 20 г. 45 м.
10, 15, 20—Партыя большэвікоў у лютаўскай буржуазна-дэмакратычнай рэволюцыі.
ДЗЁННЫЯ ПЕРАДАЧЫ
Час перадачы з 13 г. да 14 г. 15 м.
10, 15, 20—Барацьба большэвікіх арганізацый у Расіі ў часе вайны.
11, 16, 21—Барацьба большэвікоў за пераход усёй улады к Советам.
12, 17, 22—Партыя большэвікоў пасля ліпеньскіх дзён.
ГІСТОРЫЯ СССР
1/II—Маскоўская дзяржава і сялянскія войны ў пачатку XVII стагоддзя. Барацьба з польскім нашэсцем (лекцыя 1-я).
8/II—Маскоўская дзяржава і сялянскія войны ў пачатку XVII стагоддзя. Барацьба з польскім нашэсцем (лекцыя 2-я).
11/II—Маскоўская дзяржава пры першых Раманавых і паўстанне Разіна (XVII стагоддзе).
21/II—Украіна XVI і XVII стагоддзяў. Барацьба за нацыянальную самастойнасць. Багдан Хмельніцкі
ЛЕНІНІЗМ
2/II—Ленінскае вучэнне аб перарастанні буржуазна-дэмакратычнай рэволюцыі ў сацыялістычную.
14/II—Марксізм—Энгельс—Ленін—Сталін аб дзяржаве і дыктатуры пролетарыята.
28/II—Дыктатура пролетарыята як сродак пабудавання сацыялістычнага грамадства.
ПАЛІТЭКАНОМІЯ
16/II—Развіццё гандлёвага капітала.
17/II—Развіццё крэдыта і банкі.
26/II—Развіццё капіталізма ў сельскай гаспадарцы.
27/II—Паходжанне і формы зямельнай рэнты.
ЛЕКЦЫІ ДА ВЫВУЧЭННЯ ПААСОБНЫХ ТВОРАЎ МАРКСА — ЭНГЕЛЬСА — ЛЕНІНА — СТАЛІНА
9/II—Як вывучаць твор Леніна: «Дзіцячая хвароба «левізны» ў комунізме» (лекцыя 2-я).
19/II—Як вывучаць твор Леніна «Дзяржава і рэволюцыя».
ЛЕКЦЫІ ДЛЯ ЗАВОЧНІКАЎ КУРСАЎ ВЫТВОРЧАГА АКТЫВА КАЛГАСАЎ, МТС І СОЎГАСАЎ, ВЫВУЧАЮЧЫХ КНІГУ КАРПІНСКАГА «ГУТАРКІ АБ ЛЕНІНІЗМЕ»
25/II—Што такое дыктатура пролетарыята.
ПАЛІТЫКА ПАРТЫІ Ў ВЁСЦЫ І ПЫТАННІ СТАЛІНСКАГА СТАТУТА с. г. АРЦЕЛІ
4/II—1. Захаванне і выхаванне маладняка і кармленне саломай у стойлавы перыяд.
2. Як хаваць, ачышчаць, пратручваць і правяраць на ўсхожасць насенне.
7/II—Складанне гадавога вытворчага плана калгаса.
БЯГУЧАЯ ПАЛІТЫКА ПАРТЫІ І ЎРАДА
5 лютага. Тэма лекцыі будзе абвешчана па радыё.
Р а з е р в — 22 лютага
ТАВАРЫШЫ ЗАВОЧНІКІ І РАДЫЁСЛУХАЧЫ!
Слухайце лекцыі ў спецыяльна абсталяваных радыёаўдыторыях пры партгабінетах, чырвоных кутках і праз свае прымачкі і радыёкропкі. Пытанні, якія ўзнікнуць у сувязі з праслуханай намі лекцыяй і прапрацоўкай вучэбнай літаратуры, а таксама водзывы і заўвагі аб лекцыях накіроўвайце па адрасу: г. Менск, вул. Карла Маркса, 47/30, БІМЗО.
ДЫРЭКЦЫЯ ІНСТЫТУТА.

Уп. Галоўлітбела № 552. Друкарня газеты «Звязда» Менск Совецкая 63. Ч. Б. С.